Школьнікі 30 гадоў таму

СТАР. 5

Без дамоў- інтэрнатаў

СТАР. 5

Ці застануцца браты Запашныя ў Мінску жыць?

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

2 ВЕРАСНЯ 2015 г. СЕРАДА № 167 (28025) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Афіцыйна

ПРЭЗІДЭНТ ЗНАХОДЗІЦЦА З ВІЗІТАМ У КІТАІ

Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з рабочым візітам у Кітайскую Народную Рэспубліку, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Плануецца, што кіраўнік дзяржавы прыме ўдзел ва ўрачыстых мерапрыемствах, прымеркаваных да 70-годдзя перамогі ў антыяпонскай вайне і заканчэння Другой сусветнай вайны. У ходзе візіту прадугледжаны таксама шэраг двухбаковых сустрэч Аляксандра Лукашэнкі з кіраўніцтвам КНР.

■ Выбары-2015

ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫЯ КАМІСІІ ПРАВЕРЫЛІ ПОДПІСЫ

Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў размясціла на сваім сайце папярэднія звесткі аб колькасці выбаршчыкаў, што пакінулі свае подпісы за кожнага з прэтэндэнтаў на пост Прэзідэнта.

Нагадаем, больш за сто тысяч подпісаў у тэрытарыяльныя камісіі перадалі ініцыятыўныя групы наступных прэтэндэнтаў: Аляксандра Лукашэнкі, Сяргея Гайдукевіча, Віктара Цярэшчанкі, Мікалая Улаховіча, Таццяны Караткевіч.

Пасля праверкі подпісаў тэрытарыяльныя камісіі ўстанавілі, што колькасць сапраўдных подпісаў у падтрымку дзейнага кіраўніка дзяржавы склала 1 753 380, у падтрымку Мікалая Улаховіча — 149 819, Сяргея Гайдукевіча — 139 877, Таццяны Караткевіч — 105 278. Вынікі праверкі паказалі, што за Віктара Цярэшчанку здадзена 6 699 сапраўдных подпісаў.

Наступным этапам выбарчай кампаніі стане рэгістрацыя кандыдатаў на пост кіраўніка дзяржавы. Як паведамлялася раней, ЦВК плануе правесці яе 10 верасня, а с 11 верасня пачнецца перыяд перадвыбарнай агітацыі і прапаганды.

Цяпер з 22 жніўня па 5 верасня ідзе падача ў Цэнтральную камісію дакументаў для рэгістрацыі.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

Віват, суворайцы і курсанты!

Фота Надзеі БУЖАН.

Юны «навабранец» Ілья Круглоў, якога сёлета разам з іншымі залічылі ў Мінскае суворайскае ваеннае вучылішча, разам са сваім бацькам Ігарам Уладзіміравічам.

Сёлета выхаванцамі Мінскага суворайскага ваеннага вучылішча сталі 70 чалавек. Звыш 700 грамадзян папоўнілі курсанцкія шэрагі краіны

СТАР. 2

ЦЫТАТА ДНЯ

Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі:

«Мы сёння бачым, што беларусы не абыякавыя да сваёй будучыні, да сваёй краіны, і таму назіраем актыўнасць, абмеркаванне. Але самае галоўнае, што мы забяспечваем права ўсіх, хто будзе зарэгістраваны кандыдатам у Прэзідэнты, на прадстаўленне сваёй праграмы, давядзенне сваёй пазіцыі да выбаршчыкаў, для таго каб грамадзяне Беларусі зрабілі свой свядомы выбар на карысць будучыні незалежнай Беларусі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 02.09.2015 г.

Долар ЗША	17399,00	▼
Еўра	19661,00	▲
Рас. руб.	266,00	▲
Укр. грыўня	802,72	▼

■ Прамая лінія

Служба 101 заўсёды на сувязі

За кошт чаго ўдалося рэзка знізіць колькасць загінулых на пажарах? Як беларускія ратаўнікі супрацоўнічаюць з украінскімі калегамі? Ці можна здаць у падраздзяленні МНС энергазберагальныя лямпы? У чым спецыфіка групы рызыкі ў розных краінах свету? На гэтыя і іншыя пытанні адказаў падчас «прамой лініі» міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

— Гэтым летам у Беларусь перакідвалася шмат лясных пажараў з Украіны. Растлумачце, калі ласка, як адбываецца супрацоўніцтва з тамтэйшымі падраздзяленнямі МНС? Усё-такі з-за ўзгарванняў, якія ўзнікаюць там, страты нясе беларускі лясны фонд...

— Праблема пажараў, якія прыходзяць з Украіны да нас, існуе. Але будзем справядлівымі: з улікам шэрагу абставін на тым баку дзяржаўнай мяжы нельга сказаць, што там нічога не робяць. Разам з тым частыя перастаноўкі ў кіраўніцтве тамтэйшымі падраздзяленнямі МНС працу ўскладняюць істотна. У нас з украінцамі заключана адпаведнае пагадненне, падпісана шмат іншых дагавораў, перыядычна праводзяцца сумесныя вучэнні. Адны з іх, па тушэнні нафтагазавых фантанаў, прайшлі некалькі гадоў таму на такой базе, якой не было нават у нас. Сёлета ж украінскімі ратаўнікамі зноў кіруе новы чалавек. З першым намеснікам міністра мы ўжо гутарылі на тэму пажараў ля беларускай мяжы. Але папракнуць іх у бяздзейнасці мы не можам. Іншая справа, што, мабыць, няма такой эфектыўнасці, якой бы хацелася бачыць нам, — кожны ж працуе ў меру сваіх магчымасцяў і фінансавання. І катастрафічнага развіцця пажараў не дапускаюць. Сітуацыю ўскладняюць зоны, багатыя на дары лесу, і разам з тым цяжкапраходныя для спецыяльнай тэхнікі.

Падчас апошніх пажараў былі вымушаны задзейнічаць авіяцыю. І як толькі пачалася гэтая навала, мы напісалі лісты ў Брэсцкі і Гомельскі аблвыканкам з просьбай прапрацаваць пытанні ўзаемадзеяння з украінскімі памежнымі абласцямі. Патушылі на сумежных тэрыторыях 11 пажараў. Прыязджалі мы і ў Чарнігаўскую вобласць на тушэнне ўзгарванняў.

СТАР. 4

■ Смачна і бяспечна

ШТО НА ТАЛЕРЦЫ Ў КЛІЕНТА?

За якія парушэнні прыпыняецца праца аб'ектаў грамадскага харчавання

Нядаўна сяброўка распавяла гісторыю пра тое, як прайшоў яе «рамантычны вечар» у рэстаране. Аня ў падрабязнасцях падзялілася тым, што ў гарбаце ёй папаўся чарвяк, узгадала, як гарачае падалі халодным, а афіцыянтка ўвесь час падганяла есці хутчэй, бо «яны зачыняюцца на спецабслугоўванне». Выслухаўшы яе, я задумалася над тым, а ці ведае хто-небудзь з кліентаў, што робіцца там, на кухні рэстаранаў і кавярняў? З якіх прадуктаў гатуюцца стравы? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні карэспандэнты «Звязды» знайшлі, выправіўшыся разам з супрацоўнікамі Міністэрства гандлю ў рэйд па аб'ектах грамадскага харчавання.



Фота Надзеі БУЖАН.

ПРА ЗВАРОТЫ, ЧОРНЫ СПІС І ПОЎДЗЕНЬ

Да супрацоўнікаў гандлёвай інспекцыі мы з фотакарэспандэнтам далучаемся каля дванаццаці гадзін дня. Час выбраны не выпадкова. Менавіта апоўдні адчыняе свае дзверы сталічны рэстаран хуткага абслугоўвання «Byblos». Ён на той дзень і стаў аб'ектам праверкі. У Мінгандлі кажуць, што з ёй лепш прыходзіць менавіта пад адкрыццё: «Так можна знайсці больш недахопаў».

СТАР. 3

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

СМІ паведамілі аб з'яўленні расійскай авіяцыі ў Сірыі

У Сірыю прыбываюць расійскія самалёты, яны ўключацца ў паветраныя ўдары па сілах «Ісламскай дзяржавы». Паводле паведамленняў дыпламатычных крыніц, у найбліжэйшы час на авіябазе пад Дамаскам павінны быць разгорнутыя сілы ў некалькі тысяч расійскіх вайскоўцаў, якія прымуць удзел у барацьбе з баевікамі-ісламістамі.

Краіны ЕС павінны падзяліць адказнасць у пытанні бежанцаў

Пра гэта заявіла канцлер ФРГ Ангела Меркель. «Сітуацыя нездавальняючая», — сказала яна. «Краіны-члены павінны падзяліць адказнасць. Калі ЕС пацерпіць крах у пытанні бежанцаў, то ў выніку ў нас будзе не тая Еўропа, якую мы ведаем», — падкрэсліла Меркель. У дачыненні да пратэстаў супраць прыёму бежанцаў яна сказала: «Не будзе талерантнасці ў дачыненні да тых, хто ставіць пад пытанне годнасць іншых людзей». Ангела Меркель заклікала грамадзян краіны не ўдзельнічаць у акцыях пратэсту супраць прыёму бежанцаў. Адначасова яна паведаміла, што ўлады ФРГ маюць намер прыняць шырокі пакет мер для вырашэння праблемы.

Расійскія школьнікі будуць вучыць па дзве замежныя мовы

Другая замежная мова ўключана ў пералік абавязковых прадметаў школьнай адукацыі. Дзеці будуць вывучаць яе з 5-га па 9-ы клас. Школам даецца пераходны перыяд з улікам таго, што не ўсе рэгіёны пакуль да гэтага гатовыя, паведаміў кіраўнік Мінадукнавукі РФ Дзмітрый Ліванаў.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

У Польшчы знойдзены цягнік з «золатам нацыстаў»?

Польскія ўлады былі вымушаныя забяспечваць доступ у зону на паўднёвым захадзе краіны, дзе, як мяркуецца, знаходзіцца цягнік з «золатам нацыстаў», пасля таго, як туды хлынулі паляўнічыя на скарбы, паведамляюць інфармагенцтвы.

Паводле некаторай інфармацыі, месца апошняй стаянкі нацысцкага цягніка знаходзіцца на ўчастку паміж 61-м і 65-м кіламетрамі чыгункі з Валбжыху ва Уроцлаў. Зону патрулюе паліцыя, а таксама гарадскія і чыгуначныя сілы аховы правапарадку. Нагадаем, на мінулым тыдні польскія ўлады паведамілі, што паказанні радара пацвердзілі знаходжанне бронецягніка пад зямлёй у ваколіцах горада Валбжых. Ён выяўлены менавіта ў тым месцы, пра якое і расказаў двум шукальнікам скарбаў перад смерцю мясцовы жыхар, які сцвярджаў, што дапамагаў схаваць цягнік.

КАРАТКА

Фонд ААН у галіне народанасельніцтва і Упраўлення ААН па абслугоўванні праектаў прадаставіць Беларусі $3,7 млн на дасягненне нацпрыярытэтаў у сацыяльна-эканамічнай сферы.

Знешні дзяржаўны доўг Беларусі па стане на 1 жніўня склаў $12,5 млрд і зменшыўся з пачатку года на $42,9 млн, або на 0,3% (з улікам курсавых розніц).

Памер сяроднеўзважанай увазной мытнай пошліны ў Еўразійскім эканамічным саюзе з 1 верасня знізіцца да 5-5,3%. Істотным будзе зніжэнне пошлін на электрамашыны, электроніку, тэлепрыёмнікі, асвятляльныя тавары, сістэмы пералівання крыві і шэраг іншых тавараў груп.

Графіці-партрэт графа Чапскага з'явіцца на адной са сцен дома на вуліцы Кастрычніцкай у Мінску, паведамілі арганізатары другога беларуска-бразільскага street art-фестывалю Vulica Brasil, які праходзіць з 30 жніўня па 12 верасня.

■ Пакажы прыклад!

ФОРМА ДЛЯ ВУЧНЯЎ І... ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Пілотны праект «Школа будучыні» ахопіць у новым навучальным годзе 725 школьнікаў з розных рэгіёнаў краіны. Ідэя яго аўтараў заключаецца ў тым, каб уніфікаваць адзенне дзелавога стылю для вучняў пачатковай школы і максімальна задзейнічаць пры гэтым патэнцыял айчынных прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці.

Па словах старшыні канцэрна «Беллегпрам» Мікалая ЯФІМЧЫКА, гэта зусім не азначае, што ўсе дзеці будуць апранутыя аднолькава. «Нават у адной школе вучні розных класаў могуць выбіраць разам з бацькамі форму на свой густ. Галоўнае, што гэта будзе дзелавое адзенне, а выбар застанецца за навучальнымі ўстановамі. Напрыклад, у нас ёсць гімназіі, якія маюць свой твар і імідж, а з дапамогай адзення яны змогуць яго толькі дадаткова падкрэсліць», — патлумачыў ён.

Старшыня канцэрна запэўніў, што швейныя прадпрыемствы гатовы задаволіць любыя запыты вучняў, у тым ліку вышываць на вопратцы лагатыпы, эмблемы і фірменныя знакі школ.

СТАР. 3

НОВЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА КАНСЕРВАТЫЎНАЙ ГАЛІНЫ

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ наведаў свята першага звонка ў Астравецкай гімназіі №1.

Зразумела, не абышлося без віншаванняў і падарункаў. Ад Савета Рэспублікі гімназістам падарылі мультыборд, ад Гродзенскага аблвыканкама — сучасны камп'ютар, ад райвыканкама — дакумент-камеру. А падарункам першакласнікам сталі кнігі «Беларусь — наша Радзіма»

У гэты ж дзень у Астраўцы стартаваў «Марафон ведаў гісторыі вайны» — як сімвал жыцця ў мірнай краіне і шчаслівага дзяцінства ў неба ўзляцелі сотні паветраных шарыкаў.

— Асабліва радуе, што ўзрасла колькасць першакласнікаў. У цэлым па краіне сёлета ўпершыню за парты селі 106,5 тысячы хлопчыкаў і дзяўчатак — гэта на 1 600 больш, чым летась, — зазначыў Міхаіл Мясніковіч. — Гэта мы ўбачылі і ў новай гімназіі: у мінулым годзе тут былі два першыя класы, а сёлета — ужо тры.

У гэтай навучальнай установе створаны выдатныя ўмовы для вучобы, заняткаў фізкультурай і спортам, харчавання вучняў. Пры гэтым, лічыць Міхаіл Мясніковіч, не менш важнае значэнне маюць энтузіязм, крэатыўнасць дырэктара і выкладчыкаў, якія настроены на тое, каб дзеці выраслі дастойнымі грамадзянамі Беларусі:

— Увогуле адукацыя — даволі кансерватыўная галіна. Але жыццё ставіць перад ёй новыя патрабаванні, і школа павінна адпавядаць выклікам сучаснасці. Гэта асноўная задача, і яна паспяхова вырашаецца ў нашай краіне.

Члены Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу наведалі інфармацыйны цэнтр Беларускай АЭС, аб'екты яе вытворчай базы, а таксама жылой забудовы першага і другога мікрараёнаў. А затым разгледзелі пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця Астравецкага раёна — у прыватнасці, забеспячэння сацыяльнай сферы кваліфікаванымі кадрамі, стварэння аб'ектаў фізкультурна-аздараўленчага прызначэння, утрымання і абслугоўвання дарог.

Калі распачыналася будаўніцтва АЭС, было меркаванне, што горад атамшчыкаў павінен размяшчацца асобна ад райцэнтра. Аднак кіраўнік дзяржавы прыняў рашэнне аб пашырэнні Астраўца, каб на існуючай базе зрабіць сучасны горад, дзе будзе камфортна і новым жыхарам, і тым, хто жыве тут цяпер. І ў гэтым кірунку ўжо шмат зроблена.

— У сувязі з будаўніцтвам атамнай электрастанцыі Астравецкі раён развіваецца хуткімі тэмпамі, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч. — Сюды прыязджае шмат будаўнікоў, і трэба думаць не толькі пра іх і будучых атамшчыкаў, але і пра членаў іх сем'яў, не звязаных працоўнымі адносінамі з Беларускай АЭС. Павінны вырашацца пытанні стварэння новых працоўных месцаў, арганізацыі побыту і вольнага часу як для тых, хто заняты на будаўніцтве АЭС, так і для іх сем'яў.

Алена ЯРАШЭВІЧ.

ДОБРЫЯ ВЕДЫ ПАТРЭБНЫЯ ЎСЮДЫ

Пытанню ўкамплектавання сельскіх школ кадрамі ўдзяляецца асаблівая ўвага

Пра гэта ўчора заявіла намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА, якая наведала ДУА «Дукорскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад — сярэдняя школа» ў Пухавіцкім раёне, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

Намеснік прэм'ер-міністра прыняла ўдзел ва ўрачыстай лінейцы з нагоды Дня ведаў, агледзела школу. Ацэньваючы матэрыяльна-тэхнічнае абсталяванне навучальнай установы, віцэ-прэм'ер адзначыла: «Нягледзячы на тое, што гэта сельская школа, яна добра развіваецца, ёсць трэнажорная зала, ёсць нядрэнныя кабінеты, зроблены рамонт. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне — гэта вельмі важна пры падрыхтоўцы школьнікаў. Але важней тое, каб тут былі педагагічныя кадры». Сёлета ў сваю родную школу прыбыў на працу малады спецыяліст, якому адразу далі жыллё. «Мы павінны зрабіць усё, каб сельскія школы былі ўкамплектаваны кадрамі», — сказала Наталля Качанава. Яна падкрэсліла, што якасць адукацыі ў сельскіх школах не саступае ўзроўню гарадскіх. Аб гэтым сведчаць вынікі цэнтралізаванага тэсціравання. «Займаючыся сёлета гэтым пытаннем, мы ўбачылі, што вельмі добрыя вынікі ў сельскіх школах. Гэта гаворыць аб тым, што там добрыя выкладчыкі, якія могуць даць якасныя веды», — упэўнена намеснік прэм'ер-міністра.

У цэлым, па словах віцэ-прэм'ера, сістэма адукацыі ў Беларусі ўжо склалася, вядзецца работа па яе ўдасканаленні. Напрыклад, адным з наваўвядзенняў сталі профільныя класы. Наталлю Качанаву таксама цікавіла, як у школе выбудаваная гуртковая праца і як праводзяцца заняткі спортам.

■ Першы ўрок

«ПРЫРОДА БЕЗ ЧАЛАВЕКА ЗМОЖА. А МЫ БЕЗ ЯЕ?»

Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольля Андрэй КАЎХУТА павіншаваў навучэнцаў сталічнай гімназіі №19 з Днём ведаў.

Гімназія №19 стала своеасаблівай пляцоўкай для розных «зялёных» праектаў. На яе базе створана экалагічнае грамадскае аб'яднанне «Наш след», з 2006 года наладжана сістэма асобнага збору адходаў. Сёлета быў запушчаны «EcoGymn» — «экалагічны часопіс ад школьнікаў і для школьнікаў» (дарэчы, праект прайшоў у фінал конкурсу «100 ідэй для Беларусі»), а на школьным двары з'явілася велапаркоўка. Праекты «Дадзім адходам другі шанц», «Планета без адходаў» даюць магчымасць ператвараць смецце ў сувеніры і стыльныя рэчы. «Школа энергазберажэння» працуе не толькі для школьнікаў: заняткі праводзяцца таксама для ветэранаў і пажылых людзей. Дзеці арганізавалі цэнтр дапамогі беспрытульным жывёлам: на акцыях «Шчасце з хвосцікам» яны збіраюць грошы для прытулкаў.

— Вы сапраўднае «зялёнае ядро» ў экалагічнай адукацыі, — сказаў Андрэй Каўхута. — Іншыя школы могуць браць з вас прыклад. Аднак мы займаемся развіццём гэтага напрамку: у Беларусі створана цэлая сетка «зялёных» школ, якая ахоплівае каля 200 адукацыйных устаноў.

На развітанне міністр падарыў школе некалькі асобнікаў новага выдання Чырвонай кнігі Беларусі і параіў дзецям быць адказнымі за зямлю: «Прырода без чалавека абысціся зможа. А мы без яе?»

Кацярына РАДЗЮК. *radziuk@zviazda.by*

■

■ Дзень ведаў

ПРАФСАЮЗ ДЛЯ МОЛАДЗІ — ВЫДАТНАЯ ШКОЛА ЖЫЦЦЯ

Першы ўрок у новым навучальным годзе для дзесяцікласнікаў сталічнай гімназіі №24 прайшоў у... штаб-кватэры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Традыцыя праводзіць 1 верасня гасцявыя ўрокі практыкуецца ў сталіцы даўно. Учора на сустрэчу са школьнікамі, студэнтамі і навучэнцамі прафтэхшколы прыйшлі прадстаўнікі Нацыянальнага сходу, урада, Вярхоўнага Суда, Нацыянальнага банка і Генеральнай пракуратуры, кіраўнікі канцэрнаў і губернатары, пісьменнікі і дзеячы культуры. А вось урок, прысвечаны прафсаюзнай тэматыцы, «Моладзь і прафсаюзы» прайшоў упершыню.

— Мэта нашага ўрока — расказаць школьнікам пра тое, што сёння ўваходзіць у сферу дзейнасці прафсаюзаў, пра стратэгію сацыяльнага партнёрства і перавагі, якія дае членства ў прафсаюзе, — расказаў **старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандр БОЙКА.** — Маладыя людзі яшчэ са школы добра ведаюць пра дзейнасць маладзёжных грамадскіх арганізацый, пра БРСМ, але амаль нічога не ведаюць пра дзейнасць прафсаюзаў. Для маладога пакалення наша праца не зусім зразумелая, а значыць, і не зусім блізкая. Таму вельмі шмат залежыць ад таго, у якой форме ім будзе данесена карысная інфармацыя.

Дарэчы, доля навучэнскай моладзі ў Беларускім прафсаюзе работнікаў адукацыі і навукі цяпер складае чвэрць ад агульнай колькасці. І цяперашнія дзесяцікласнікі ўсяго праз два гады таксама маюць усе шанцы папоўніць рады прафсаюза.

— У прафсаюзе — як у сям'і... Вы, напэўна, часта спрачаецеся з бацькамі. Вось і мы спрачаемся з сацыяльнымі партнёрамі, але ў нашай працы самае галоўнае — знайсці кампраміс, — звярнулася да гімназістаў **старшыня Мінскай гарадской арганізацыі прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса ВОЛКАВА.** — Здараецца, нас не разумеюць. Нам кажуць, што пытанне вырашыць немагчыма, але мы спрабуем дамаўляцца. Настойлівасць, упартасць, уменне даказаць сваю правату і жаданне абараніць іншага — неабходныя якасці для прафсаюзнага лідара.

Старшыня Мінскага гарадскога аб'яднання арганізацый прафсаюзаў Мікалай БЕЛАНОЎСКІ падкрэсліў, што «арганізацыя адкрытага ўроку менавіта ў штаб-кватэры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі — гэта спроба дабавіць да матэматычных ведаў школьнікаў (а на сустрэчу прыйшлі вучні менавіта матэматычнага класа. — Аўт.) яшчэ і веды пра магчымасці, якія дае прафсаюз.

— Вы ў сваім дарослым жыцці і прафесійнай дзейнасці неаднойчы будзеце сутыкацца са складанымі сітуацыямі, калі перад вамі паўстануць пытанні, да каго звярнуцца і хто зможа дапамагчы. Каб вы ведалі: дапамагчы вам змогуць у прафсаюзе. Мы часта чулі, што, маўляў, на Захадзе пануе «дзікі капіталізм». Але і ў нас сёння рынкавыя адносіны... Вельмі шмат парушэнняў правоў работнікаў выяўляюцца ў прыватным сектары эканомікі, — канстатаваў Мікалай Беланоўскі. — Там наймаюць шмат людзей па дагаворах падраду, не афармляючы пастаянныя працоўныя адносіны. Мы назіраем і яшчэ адну новую тэндэнцыю: наймальнікі бяруць актыўнага маладога чалавека на працу з выпрабавальным тэрмінам і адпаведным заробкам, а праз тры месяцы кажуць яму: «Прабачце, але вы нам не падышлі». І запрашаюць на яго месца новага... Аднойчы да нас трапіла інструкцыя для інвестараў, у якой змяшчалася 10 пунктаў-парад для тых, хто хоча рабіць бізнес ва Усходняй Еўропе. Першым пунктам там была наяўнасць развітой інфраструктуры. Другім — высокакваліфікаваныя кадры. А трэцяя падказка — адсутнасць у краіне моцных прафсаюзаў, таму што ўсе жадаюць атрымліваць максімальны вынік пры мінімуме ўкладанняў.

Гімназістам расказалі, што ў маі бягучага года пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі быў створаны **Маладзёжны савет ФПБ.** У яго склад увайшлі 43 прадстаўнікі пярвічных прафсаюзных арганізацый найбуйнейшых беларускіх прадпрыемстваў, вышэйшых, сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў. Маладзёжны савет ФПБ будзе прадстаўляць інтарэсы каля 2 мільёнаў чалавек. Інтарэсы навучэнскай і працоўнай моладзі могуць не супадаць, таму для таго, каб улічваліся меркаванні ўсіх, і быў створаны Маладзёжны савет.

— Для студэнтаў работа ў прафкаме была і застаецца цудоўнай школай працы з людзьмі і дзеля людзей, — падкрэсліў Аляксандр Бойка. — Маладым людзям, якія не проста «былі» ў прафсаюзе, а сталі яго актыўнай часткай, прымалі самы непасрэдны ўдзел у рэалізацыі прафсаюзных ініцыятыў і праектаў, удаецца многае і ва ўласнай кар'еры.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@mail.ru

■

■ Фінансы

З'ЯВІЛІСЯ КРЭДЫТЫ І НА КУПЛЮ КВАТЭР

З першых дзён восені Беларусбанк зноў пачаў выдаваць крэдыты на набыццё жылых памяшканняў на другасным рынку нерухомасці, паведамляе прэс-служба банка.

Цяпер крэдыт выдаецца ў беларускіх рублях на тэрмін да 15 гадоў пад 32% гадавых. Банк гатовы прафінансаваць да 75% кошту жылля. Разам з тым у кантакт-цэнтры Беларусбанка нам паведамілі, што буйную суму крэдыту, нават у памеры каля 50 тысяч долараў (870 млн рублёў), змогуць атрымаць толькі кліенты з сапраўды вялікімі заробкамі. Справа ў тым, што па ўмовах крэдытавання сукупны даход членаў сям'і або паручыцеляў не ўлічваецца. Працэнты па крэдыце выплачваюцца з наступнага месяца пасля прадастаўлення. Разлік працэнтаў ажыццяўляецца на фактычную рэшту асноўнага доўгу. Спецыялісты банка паведамляюць, што для атрымання крэдыту таксама спатрэбіцца прынесці пакет дакументаў, сярод якіх абавязкова павінен быць дагавор куплі-продажу жылля. Для забеспячэння крэдыту фінансавай установай ужываецца алгарытм паручыцельства.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■

ВІВАТ, СУВОРАЎЦЫ І КУРСАНТЫ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Упершыню за апошнія некалькі гадоў яны не куплялі святочных убораў і нават не задумваліся аб тым, якія кветкі падарыць любімаму настаўніку. Апранулі аднолькавую форму — і на пляц. Праўда, крыху з зайздрасцю пазіралі на сваіх старэйшых таварышаў з пунсовымі пагонамі, чырвонымі лампасамі на штанах і з фуражкамі на галаве. Неўзабаве і яны апрануць такую доўгачаканую форму, якую для іх — суворaўцаў-першакурснікаў — ужо шыюць. Толькі пунсовыя пагоны зазіхацелі на хлапечых плячах ужо ўчора — выпускная рота па традыцыі ўручыла іх першапачаткоўцам.

Фота Надзеі БУКАН.

Каб паглядзець на прыгожую цырымонію пасвячэння першакурснікаў у суворaўцы, на тэрыторыі Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча сабраліся родныя і блізкія навічкоў. А разам з тым пажадаць добрага шляху: на цэлых пяць гадоў вучылішча стане для падлеткаў родным домам.

Кожны з іх па розных прычынах трапіў сюды. Адным парэкамендавалі бацькі, для іншых — гэта была мара ўсяго жыцця. Як напрыклад, для Кірыла Бельскага, які на працягу пяці гадоў ездзіў у вучылішча на Дні адчыненых дзвярэй. Яму настолькі хацелася стаць суворaўцам, што ўвесь вольны час хлопец рыхтаваўся да іспытаў па мове і матэматыцы, удасканальваў сваю фізічную падрыхтоўку. І гэта нягледзячы на тое, што ён сірата і паступіў бы сюды без усялякага конкурсу. Але падлетак сваім становішчам карыстацца не хацеў — і ў выніку стаў другім (!) па рэйтынгу сярод першакурснікаў. А іх сёлета — 70.

— Конкурс у суворaўскае вучылішча на працягу апошніх гадоў складае 5-7 чалавек на месца, — зазначыў **начальнік Мінскага суворaўскага ваеннага вучылішча генерал-маёр Віктар ЛІСОЎСКІ.** — І гэты год не стаў выключэннем. Ужо на першапачатковым этапе ўступнай кампаніі мы звярнулі ўвагу на тое, наколькі высокі ўзровень падрыхтоўкі ў нашых кандыдатаў. Парадавала, што, паступаючы ў вучылішча, практычна 100% падлеткаў матывавана на тое, каб у выніку працягнуць навучанне ў сістэме вышэйшай ваеннай адукацыі: у акадэміі або на ваенных факультэтах вядучых універсітэтаў краіны.

Між іншым, з 72 выпускнікоў гэтага года практычна 90% зрабілі выбар на карысць афіцэрскай прафесіі. Вайскоўцам марыць стаць і сённяшні першакурснік Андрэй Салацін. Прычым юнаку ёсць на каго раўняцца: у розны час насілі пагоны яго прадзед, дзед і бацька. Аднак у суворaўскае ён паступіў не толькі таму, каб прадоўжыць вайсковую дынастыю. «Тут я атрымаю добрую адукацыю, моцную фізічную падрыхтоўку, навучуся ваеннай дысцыпліне», — упэўнены хлопец.

А вось першакурснік Павел Мішалутаў дакладна ведае, што стане афіцэрам бранятанкавых войскаў або войскаў спецыяльнага прызначэння. Тым больш што пасля заканчэння вучылішча яму, як і астатнім суворaўцам, будуць адкрыты дзверы ў Ваенную акадэмію, на ваенныя факультэты іншых ВНУ краіны. Спадзяёмся, што праз пяць гадоў мы ўбачым іх у статусе курсантаў.

Увогуле сёлета на карысць афіцэрскай прафесіі зрабілі свой выбар звыш 700 беларусаў. Першакурснікі ваенных ВНУ Беларусі прысягнулі на вернасць Радзіме ва ўрачыстай атмасферы. Курсанты Інстытута пагранічнай службы, напрыклад, прынялі прысягу на сталічнай плошчы Дзяржаўнага сцяга.

— Падзеі ва Украіне паказалі нашаму народу, якую важную ролю ў жыцці дзяржавы адыгрываюць створаныя ў нашай краіне стабільнасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні, якія падтрымліваюцца і цяпер, — перакананы **старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта генерал-палкоўнік Леанід МАЛЬЦАЎ.** — Таму ад кожнага з нас, хто ўжо даўно ў шэрагах пагранічнікаў, і тых, хто толькі ўстаў у гэты строй, на парадак вышэй патрабуецца мабілізацыя ўсіх прафесійных якасцяў, маральнага духу на выкананне пастаўленых задач.

Курсанцкія шэрагі Ваеннай акадэміі папоўнілі больш як 450 чалавек. Праўда, першым надзець пагоны, сённяшнія першакурснікі прайшлі паглыблены прафесійна-псіхалагічны адбор і вытрымалі сур'ёзныя ўступныя выпрабаванні. Напярадзе іх чакае курс агульнавайсковай практыкі. Засвоіць азы ваеннай падрыхтоўкі і прызвычаіцца да асаблівасцяў ваеннай службы ім дапамогуць вопытныя афіцэры-настаўнікі.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

ЯНУШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов 08.10.2015 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.

№ п/п	Адрес земельного участка	Площадь земельного участка	Наименование инженерных сетей	Начальная цена (бел. рублей)	Задаток (бел. рублей)	Расходы на документацию
1	д. Дениски, участок № 2а, кадастровый номер 623288004601000046	0,1368 га	Подъездные пути удовлетворительные	16 078 000	3 215 600	14 542 500
2	д. Бориски, участок № 5, кадастровый номер 623288002101000015	0,2500 га	Подъездные пути удовлетворительные	25 870 000	5 174 000	5 193 100
3	д. Жабичи, участок № 3, кадастровый номер 623288005101000022	0,2427 га	Электроснабжение	31 925 500	6 385 100	5 193 800

Задаток перечисляется на счет № 3600619171100 в ЦБУ 611 ф-ла 500 Минское управление АСБ «Беларусбанк» МФО 153001601, УНП 600181536, Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

Аукцион состоится **08.10.2015 г. в 10.00** по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются **до 03.10.2015 г.** (последний день подачи заявления **02.10.2015 г. до 17.00**) по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Центральная, д. 36.

Контактные телефоны: (8 01774) 57-4-35, 57-4-99.

РАЗМОВА НА РОЎНЫХ

Уладзімір Андрэйчанка выступіў у Нью-Ёрку перад калегамі

На Сусветнай канферэнцыі спікераў парламентаў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, расказаў пра дасягненні нашай краіны і яе гатоўнасць для далейшай міратворчай місіі.

Кіраўнік беларускага парламента прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця Сусветнай канферэнцыі спікераў парламентаў 31 жніўня ў Нью-Ёрку (ЗША) у зале Генеральнай Асамблеі ААН. На цырымоніі выступілі старшыня Міжпарламенцкага саюза Сабер Чаудхуры і генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун.

АБМЕРКАВАЛІ ПАЛЁГКУ ДЛЯ ТУРЫСТАЎ

У той жа дзень Уладзімір Андрэйчанка правёў шэраг двухбаковых сустрэч. З тайландскім калегам была абмеркавана арганізацыя візіту беларускай парламенцкай дэлегацыі ў Тайланд у наступным годзе. Спікеры пагадзіліся, што гэты візіт унясе адчувальны ўклад ва ўмацаванне беларуска-тайландскіх сувязяў і развіццё двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва.

Кіраўнікі парламентаў таксама абмеркавалі перспектывы фарміравання дагаворна-прававой базы двухбаковага супрацоўніцтва, у тым ліку падпісання адпаведнага пагаднення, адзначылі канструктыўнае ўзаемадзеянне парламентарыяў дзвюх краін у рамках Міжпарламенцкага саюза і Міжпарламенцкай асамблеі АСЕАН. Уладзімір Андрэйчанка вітаў стварэнне беларуска-тайландскай групы дружбы ў парламенце Тайланда. Яшчэ адной тэмай для абмеркавання сталі гуманітарныя сувязі, стварэнне спрыяльных умоў для развіцця турызму, спрашчэнне працэдуры ўезду беларускіх грамадзян у Тайланд. Была таксама выказана зацікаўленасць у завяршэнні працэдур узаемнага прызначэння ганаровых консулаў у гэтым годзе.

...І МАГЧЫМАСЦІ ЗОНЫ СВАБОДНАГА ГАНДЛЮ

Старшыня Палаты прадстаўнікоў таксама сустрэўся са Старшынёй Нацыянальнага сходу Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Нгуен Шынь Хунг. Бакі з задавальненнем канстатавалі, што беларуска-в'етнамскія міжпарламенцкія сувязі носяць дзелавы, сістэмны характар і прыносяць рэальную аддачу. Уладзімір Андрэйчанка і Нгуен Шынь Хунг выказалі зацікаўленасць у значным пашырэнні двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Пры гэтым яны адзначылі дадатковыя перспектывы для супрацоўніцтва, якія адкрывае нядаўна падпісанае пагадненне аб зоне свабоднага гандлю паміж дзяржавамі — членамі Еўразійскага эканамічнага саюза і Сацыялістычнай Рэспублікай В'етнам.

Уладзімір Андрэйчанка асобна сустрэўся з генеральным сакратаром ААН Пан Гі Мунам. Пан Гі Мун выказаў задавальненне ўдзелам Рэспублікі Беларусь у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

У сваю чаргу, Старшыня Палаты прадстаўнікоў запэўніў, што беларускі парламент гатовы паўнавартасна спрыяць ажыццяўленню парадку дня ўстойлівага развіцця, у тым ліку праз заканатворчую працу, узаемадзеянне з урадам, бізнесам, грамадзянскай супольнасцю, удзел у аглядзе выканання парадку. Ён падкрэсліў, што Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь гатовы ўдзельнічаць у адпаведнай парламенцкай працы на рэгіянальным і міжнародным узроўнях.

НАШЫ ДАСЯГНЕННІ І АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

Уладзімір Андрэйчанка выступіў на 4-й Сусветнай канферэнцыі спікераў парламентаў. Ён адзначыў важнасць удзелу нацыянальных парламентаў у распрацоўцы мэт устойлівага развіцця на наступныя 15 гадоў. «Мы цалкам падтрымліваем намаганні Міжпарламенцкага саюза па ўмацаванні адносін паміж парламентамі і Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый, — сказаў ён. — Выклікі, якія стаяць перад намі сёння, падкрэсліваюць значнасць парламента як асноўнага інстытута любой дэмакратычнай дзяржавы».

Уладзімір Андрэйчанка паведаміў, што Беларусь датэрмінова выканала мэты развіцця тысячагоддзя, звязаныя з выкараненнем галечы і голаду, забяспечыла стапрацэнтны ўзровень пісьменнасці насельніцтва, істотна знізіла мацярынскую і дзіцячую смяротнасць. «Індыкатарам поспеху Беларусі з'яўляецца той факт, што па індэксе чалавечага развіцця краіна займае 53-е месца ў свеце, знаходзячыся ў непасрэднай блізкасці да групы дзяржаў з вельмі высокім узроўнем чалавечага развіцця, — сказаў ён. — Сур'ёзны прагрэс дасягнуты ў забеспячэнні роўнасці мужчын і жанчын. Беларусь займае 28-е месца ў ААН па індэксе гендарнай роўнасці. Сярод беларускіх парламентарыяў каля 30 працэнтаў — жанчыны».

«Адметнамі рысамі Беларусі на фоне няпростых сусветных працэсаў з'яўляюцца сацыяльны мір і стабільнасць, адсутнасць дыскрымінацыі па нацыянальных і рэлігійных прыкметах, — заўважыў ён. — Усе гэтыя дасягненні — прамы вынік рэалізацыі курсу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па стварэнні дзяржавы для народа, у якім просты чалавек адчувае ўсебаковую абарону і мае магчымасці для рэалізацыі свайго патэнцыялу».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.
medvedeva@zviazda.by

АДУКАЦЫЙНЫ ПРАЦЭС ЯК СТРАТЭГІЯ

Дзяржава робіць акцэнт на павышэнні кваліфікацыі кіраўніцкіх кадраў

Аб гэтым заявіў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ на ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным Дню ведаў і пачатку новага навучальнага года ў Акадэміі кіравання, паведамляе БЕЛТА.

«Калі задумваешся над перспектывамі развіцця якой-небудзь галіны або асобы, то прыходзіш да думкі, што неабходна пастаянна ўдасканальвацца, развівацца, шукаць новыя формы і метады, вывучаць вопыт. Усё гэта абагульнена ў адзіным паняцці — адукацыйны працэс. Акадэмія кіравання стала не проста навучальнай установай — гэта тая стратэгія, якую выбірае дзяржава. Цяпер робіцца акцэнт на павышэнні кваліфікацыі кіраўніцкіх кадраў у сферы кіраўніцтва дзяржаўнай уладай: людзей, якія павінны прымаць рашэнні на самых розных узроўнях, каб любому грамадзяніну Беларусі было камфортна працаваць, арганізоўваць сваё жыццё», — сказаў Ігар Бузоўскі.

Ён падзякаваў першакурснікам за выбраны імі шлях — паступленне ў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Беларусі, а таксама пажадаў ім рэалізавацца як асобам і прафесіяналам.

Цяперашняя прыёмная кампанія ў Інстытуце кіраўніцкіх кадраў акадэміі вызначалася сур'ёзным узроўнем ведаў абітурыентаў: 72 працэнты тых, хто ўдзельнічаў у агульным конкурсе, атрымалі сумарны бал звыш 300. Сярод тых, хто паступіў, 71 уладальнік залатых і сярэбраных медалёў і пераможца алімпіяд.

ГАРАЧЫЯ ТЭЛЕФОНЫ

У сталіцы і абласцях працягваюць працаваць прамыя лініі

Задаць свае пытанні можна кожную суботу з 9 раніцы да поўдня. Паралельна з кіраўніцтвам абласцей прамыя тэлефонныя лініі правядуць старшыні гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў, іх намеснікі і кіраўнікі справамі.

Спецыялісты адзначаюць, што за час свайго існавання прамыя лініі паспелі змяніць прынцып узаемадзеяння паміж выканаўчай уладай на месцах і людзьмі. Цяпер грамадзяне не толькі просяць разабрацца ў складаных сітуацыях, але і актыўна ўносяць прапановы.

Чарговая сувязь адбудзецца ў гэтую суботу, 5 верасня.

Брэсцкі аблвыканкам
намеснік старшыні КЛЕЦ Андрэй Анатольевіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам
намеснік старшыні ЦЯРЭНЦЬЕЎ Уладзімір Уладзіміравіч (80212204260);

Гомельскі аблвыканкам
намеснік старшыні ПРЫВАЛАЎ Уладзімір Аляксандравіч (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам
першы намеснік старшыні ЖУК Іван Алейзавіч (80152735644);

Мінскі аблвыканкам
намеснік старшыні НЕЎМЯРЖЫЦКІ Сяргей Пятровіч (80175004160);

Магілёўскі аблвыканкам
першы намеснік старшыні ЧЫКІДА Алег Іванавіч (80222501869);

Мінскі гарвыканкам
старшыня ШОРАЦ Андрэй Віктаравіч (80172224444).

«На Беларусі Бог жыве...»

Лічыць каардынатарка «Дарогі да святыняў»

Ужо традыцыйна напярэдадні Дня беларускага пісьменства адбываецца своеасаблівы праваслаўны паломніцкі ход. Дакладней, навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў», якая сёлета пройдзе 22-гі раз і стартуе ўжо сёння. Спецыяльна для «Звязды» яе кіраўнік і арганізатар заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» пісьменніца Ніна ЗАГОРСКАЯ расказала пра тое, якім чынам стваралася паломніцкая традыцыя і чаму ў ёй варта ўзяць удзел.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Ніна Сымонаўна гартае кнігу, якую выдалі да мінулай, 21-ай па ліку, «Дарогі да святыняў». І паказвае на адну з яе заўсёдніц-удзельніц — спадарыню Лізавету, былую савецкую партыйную дзяячку, чыноўніцу. Пасля таго, як упершыню трапіла ў 2001 годзе на экспедыцыю, праніклася супольнай цеплынёю хода, прысутных людзей, яна стала вызнаваць праваслаўную веру, як і ўся яе сям'я.

І гэта толькі адна з гісторый, якія не стамляецца расказваць пісьменніца. Экспедыцыя ладзіцца ўжо болей чым два дзесяцігоддзі, таму падобных аповедаў назбіралася шмат. Па словах Ніны Сымонаўны, усё пачалося ў неспакойным 1992 годзе. Менавіта тады ў Іерусаліме запалілі Дабрадатным агнём Непагасную лампаду духоўнасці. У Мінск, у Свята-Духаў кафедральны сабор, яна прыйшла 21 мая. На Плошчы Незалежнасці арганізаваўся велізарны хрэсны ход, у якім колькасць удзельнікаў мералася неверагоднымі на той момант тысячамі. З самага пачатку правядзення Дня беларускага пісьменства адной з галоўных традыцый стала дастаўляць у храмы горада, дзе адбываецца свята, і па дарозе да яго Дабрадатны агонь.

Яшчэ адзін абавязковы складнік «Дарогі да святыняў» — пуцяводная для экспедыцыі «Загор'е-Сталовіцкая ікона», якая не раз уяўляла цуды тым, хто звяртаўся да яе па дапамогу. Зараз на месцы, дзе святыню калісьці адкапалі экскаватарам, будуюць царкву. Павольна, але храм расце... Аднак жа адным гэтым асветніцка-духоўнае паломніцтва не абыходзіцца. Яго ўдзельнікі нясуць яшчэ і сацыяльнае служэнне — наведваюць школы, інтэрнаты, дамы прытулку рознага кшталту. А на працягу ўсяго шляху высаджваюць дрэвы, ствараюць своеасаблівыя Сады малітвы. «Спачатку мы садзілі яблынькі. Але колькі яны пражывуць? Вось дуб — дык на палову тысячагоддзя, калі пашчасціць. Каб нашым прапраўнукам застаўся напамін», — кажа Ніна Загорская.

— Гэтая экспедыцыя для мяне — дарога святла, любові, умацавання нашага малавер'я. Натхненне на стваральную працу любой прафесіі, — дзеліцца сваім бачаннем «Дарогі да святыняў» кардынатарка. — Праўду пісаў Уладзімір Караткевіч: «На Беларусі Бог жыве». Ён сапраўды ёсць, і ён ратуе, апякае нашу бласлаўлёную Айчыну.

У гэтым годзе маршрут «Дарогі да святыняў» пройдзе праз Баранавіцкі, Івацэвіцкі, Пружанскі раёны і Гродзенскую вобласць. Удзельнікі экспедыцыі наведаюць мясцовыя цэрквы, школы, установы культуры, а таксама традыцыйна пасадзяць маладыя дрэўцы.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ФОРМА ДЛЯ ВУЧНЯЎ І... ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адной з эксперыментальных пляцовак стала сталічная школа №101. У праекце «Школа будучыні» ўдзельнічаюць 44 яе вучні трэціх і восьмых класаў.

Цягам навучальнага года шкаляры і іх бацькі будуць даваць ацэнку якасці тканін Мінскага камвольнага камбіната і мадэлям адзення, звесткі перададуць у «Беллегпрам».

«Школьная форма спрыяе стварэнню дзелавой атмасферы на ўроках, арганізуе вучняў і аб'ядноўвае. У той жа час яна павінна быць даступнай для сем'яў з розным узроўнем дастатку», — лічыць **дырэктар школы Святлана ГАЛАВАЦКАЯ.**

Выгляд формы распрацоўвалі пры непасрэдным удзеле школьнікаў і бацькоў: вызначылі мадэлі, выбралі сіні колер, вучнёўскі, бо ён не толькі ўрачысты, але і практычны — чарнілы на ім не так відаць. Адзенне шылі на беларускіх прадпрыемствах: сарафаны для трэцякласніц зроблены на бабруйскай «Славянцы», хлапчуковыя касцюмы-тройкі пашылі на Жлобінскай швейнай фабрыцы. Вучаніцы старшых класаў спынілі выбар на сукенках віцебскай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», а хлопчыкі ўпадабалі касцюмы-двойкі ад «Славянкі». Падключылася і трыкатажная фабрыка «Алеся», якая для старэйшых дзяўчатак пашыла жакеты, а для хлопцаў — камізэлькі. Дарэчы, камплекты выраблены за кошт спонсарскіх сродкаў, удзельнікам эксперыменту яны дасталіся бясплатна. Гэта своеасаблівы падарунак сем'ям шкаляроў да 1 верасня.

Цікава, што і настаўнікі школы могуць перайсці ў наступным навучальным годзе на адзіную форму адзення. Па словах дырэктара, калі педагогі ўбачылі вопратку вучняў, то падумалі, што нядрэнна было б і для сябе распрацаваць адзіную форму. Святлана Галавацкая паабяцала, што сярод педагогаў будзе праведзена апытанне ў залежнасці ад пажаданняў кожнага можа быць пашыты набор адзення аднаго колеру. «Камусьці больш падыходзяць штаны, камусьці — прамая спадніца, камусьці — клёш. Мы прадугледзім некалькі відаў пінжакоў і жакетаў. Галоўнае — усё адзенне будзе аднолькавага колеру. Настаўнікі схіляюцца да сіняга, праўда, ён будзе святлейшы, чым у вучняў, — адзначыла дырэктар. — Да рэвалюцыі ў выкладчыкаў гімназій таксама практыкавалася ўніфікаванае адзенне. У гэтым ёсць логіка: калі мы хочам, каб навучэнцы хадзілі ў форме, то прыклад павінны паказаць у першую чаргу настаўнікі».

Ёсць погляд, што паступова трэба ўводзіць адзіную школьную форму па ўсёй краіне. Гэта можа быць адзіная форма для школы або для рэгіёна. Аўтары праекта плануюць, што на наступны год ужо ў кожным абласным цэнтры будзе выбрана школа, вучні якой стануць насіць уніфікаванае адзенне.

Надзея НІКАЛАЕВА, *nikalaeva@zviazda.by*
Дзіяна СЕРАДЗЮК, *seradzyuk@zviazda.by*

■ Жыллё маё

ЗНОСЫ ПАД ЗАБУДОВУ КАМПЕНСУЮЦЬ ПА-НОВАМУ

У Беларусі ўдасканалілі парадак кампенсацыі бюджэту пры перасяленні забудоўшчыкамі грамадзян з жылых дамоў, якія падлягаюць зносу ў сувязі з прадастаўленнем гэтых зямельных участкаў пад жыллёвае будаўніцтва.

Сродкі, пералічаныя ў мясцовы бюджэт у якасці кампенсацыі, накіроўваюцца як на будаўніцтва і набыццё жылых памяшканняў для перасялення грамадзян з дамоў, якія будуць зносіць для забудовы, так і на выплаты грашовых кампенсацый па іх. У Міністэрстве архітэктуры таксама адзначылі, што гэта будзе рабіцца і для аплаты розніцы паміж рынкавым коштам жылых дамоў з прылеглымі да іх пабудовамі і насаджэннямі, якія падлягаюць зносу, і коштам жылых памяшканняў, якія прадаставяць.

Як удакладнілі ў ведамстве, з прыняццем гэтага ўказа ўстанаўліваецца, што кампенсацыя не робіцца з агульнай плошчы жылых памяшканняў, якія бязвыплатна перадаюцца ў камунальную ўласнасць. Акрамя таго, дакументам прадугледжана, што ў выпадках, калі заказчыкі, забудоўшчыкі прадастаўляюць грамадзянам жылыя памяшканні самастойна, пры вызначэнні памеру кампенсацыі ў разлік прымаецца не ўся плошча перададзенага грамадзяніну жылога памяшкання, а толькі плошча, якая не перавышае максімальную норму прадастаўлення жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду — 20 кв. м на аднаго чалавека.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *kryzhevich@zviazda.by*

ДЫЯЛОГ ПА ЗАКОНАХ ЧАСУ

«Літаратурны працэс і інфармацыйнае грамадства» — так называецца «круглы стол», які пройдзе ў Шчучыне 5 верасня, якраз напярэдадні Дня беларускага пісьменства. З пытаннем, якія ідэі замежныя і беларускія ўдзельнікі размовы пра лёс сучаснай літаратуры збіраюцца агучыць у Шчучыне, мы звярнуліся да самых розных паэтаў, празаікаў і літаратуразнаўцаў. І вось што пачулі ў адказ.

Алесь БАДАК,
дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура», паэт, празаік:

— Мяне цікавіць, які партрэт Беларусі складваецца ў свеце дзякуючы мастацкім творам. Ці спрыяюць наша айчынная літаратура і пераклады з яе стварэнню таго вобраза краіны, над якім сёння рупіцца ўвесь наш народ, усе інстытуты ўлады? Пра гэта я хацеў бы запытацца ва ўдзельнікаў «круглага стала». А часам і нешта падказаць ім для рэалізацыі перакладчыцкіх памкненняў у дачыненні да беларускай літаратуры.

Слабадан ВУКАНАВІЧ,
паэт, перакладчык (Чарнагорыя):

— У нашай невялікай краіне з багатымі традыцыямі дружбы са славянскімі народамі Беларусь добра ведаюць. І ў значнай ступені — з-за шматлікіх перакладаў як класікі, так і сучаснай беларускай літаратуры. Асабліва шмат у апошнія гады чарнагорцы перакладалі вершаў беларускіх паэтаў. Народ з такой лірыкай, такой грамадзянскай паэзіяй, як мне здаецца, здольны да многіх здзяйсненняў.

Георгій ПРАХІН,
дырэктар выдавецтва «Художественная литература», празаік (Расійская Федэрацыя):

— Я добра ведаю з даўніх, ранейшых часін Беларусь. Зразумела, што фундамент савецкай рэчаіснасці дае нам права гаварыць, што ў многім беларусы і расіяне падобныя. Але ж і розныя. Добры, спагадлівы, на дзіва шчыры беларускі народ з постсавецкай прасторы прыкладам міралюбства, чуласці. Відаць, не ў апошнюю чаргу на развіццё і захаванне гэтых якасцяў уплываюць культура, літаратура. Ганарыцеся гэтым і захоўвайце надалей такія якасці — як і ў літаратуры, так і ў грамадстве ў цэлым.

Чынгіз АЛІ АГЛУ,
паэт (Азербайджан):

— З вялікім задавальненнем вельмі часта прыязджаю ў Беларусь. Можна сказаць, пачынаючы недзе з сярэдзіны 1980-х гадоў, парадніўся з беларусамі, беларускімі паэтамі, пісьменнікамі. Мне блізкія і да болю зразумелыя Хатынь, Брэсцкая крэпасць, Белавежская пушча. Я ў захапленні ад Мірскага замка, іншых вобразаў і сімвалаў вашай вялікай і шчодрай на праявы сардэчнай дабрыні краіны. Радуюся, што беларусы вельмі шмат перакладаюць з маёй паэзіі. Ведаю, што перакладалі і друкавалі ў Мінску і іншых паэтаў Азербайджана розных пакаленняў. Мастацкія і культурныя масты паразумення бачацца мне досыць трывалымі ў супрацьстаянні разбуральнаму глабалізму. Пра гэта, пэўна, і трэба весці размову на «круглым стале» ў спадзяванні, што і мастацкае слова не чужое сучасным масмедыя, якія так актыўна ўплываюць на свядомасць людзей.

Святлана АНАНЬЕВА,
літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук (Казахстан):

— У Казахстане мы выдалі некалькі калектыўных прац, прысвечаных сённяшняму стану мастацкай літаратуры ў свеце. І беларуская тэма, нацыянальная беларуская літаратура заняла ў іх годнае месца. Свет, падзеі на планеце Зямля нельга вывучаць без параўнання. Зараз у нас у Казахстане па ініцыятыве ўніверсітэцкіх навукоўцаў ствараецца Асацыяцыя параўнальнага літаратуразнаўства. Збіраючы паплечнікаў, міралюбівых творчых людзей з розных куточкаў свету, беларусы ўжо справамі сваімі даўно заклалі падмурак падобнай асацыяцыі. Падмурак яднання ва ўсталяванні прыярытэтаў добрасуседства, узаемапаразумення. Варта і надалей кіравацца гэтым, варта і надалей спрыяць такім ініцыятывам пісьменніка ў дыялогу з грамадствам, чытачом. Якой бы звышардынарнай ні здавалася тая ці іншая тэма, тая ці іншая мастацкая навізна, яна нічога не вартая, калі працуе на разбурэнне, вядзе да кровапраліцця. Слова не павінна быць прычынай варажнечы народаў і краін.

Кастусь ЛАДУЦЬКА.
Фота Канстанціна ДРОБАВА.

ШТО НА ТАЛЕРЦЫ Ў КЛІЕНТА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Дзень добры! Паклічце, калі ласка, загадчыцу, — звяртаецца да афіцыянткі **Наталля ВАСІЛЕЎСКАЯ, начальнік аддзела кантролю па Мінску** гандлёвай інспекцыі Міністэрства гандлю.



Падчас праверкі былі выяўлены прыгатаваныя «заўтрашнім днём» прадукты.

Дзяўчына з падносам хуценька накіроўваецца ў бок кухні і знікае хвілін на дзесяць. Пакуль мы чакалі прадстаўнікоў кіраўніцтва рэстарана, я пацікавілася, чым «не дагадзіла» Мінгандлю менавіта гэтая ўстанова, і па якім прынцыпе ўвогуле адбіраюцца аб'екты для праверак?

— Усе праверкі можна падзяліць на планавыя і пазапланавыя. Пра першыя вядома загадзя, да іх рэстараны, кавярні, крамы рыхтуюцца. Аднак часцей за ўсё мы прыходзім нечакана. І для такіх рэйдаў павінны быць падставы. Імі, напрыклад, могуць паслужыць звароты грамадзян, — тлумачыць Наталля Васілеўская.

Дарэчы, беларусы ў гэтым плане вельмі актыўныя. За дзень на «тэлефон даверу» паступае каля дзесяці званкоў. Кожны такі зварот кантралёры Мінгандлю разглядаюць і маюць поўнае права адправіцца на аб'ект з праверкай. Але спецыялісты гандлёвай інспекцыі папярэджваюць, што зварот трэба афарміць карэктна. Грамадзяніну абавязкова трэба прадставіцца, аргументавана апісаць праблему, пакінуць свае кантакты для зваротнай сувязі.

— Крама ці кавярня заўсёды можа аспрэчыць наша рашэнне ў судзе, таму добра, калі ёсць канкрэтны сведка. Вось для гэтага нам і патрэбна інфармацыя пра спажыўца. Калі яе няма, адзінае, што можа зрабіць кантралёр, — гэта ўнесці той ці іншы аб'ект у так званы чорны спіс, — расказвае Наталля Васілеўская.

Гэта азначае, што інспектары будуць мець на ўвазе «нядобрую ўстанову» і абавязкова наведаюцца туды «тайна», калі, напрыклад, будуць працаваць дзе-небудзь непадалёк. Калі факт парушэння пацвердзіцца, супрацоўнікі гандлёвай інспекцыі афармяць афіцыйную праверку.

«Вось гэтыя дзве бутэлькі я фатаграфую, каб потым выкарыстоўваць здымкі як доказы парушэння, — тлумачыць свае дзеянні Наталля Васілеўская. — Белае віно пратэрмінавана на паўгода, сіроп — на месяц».

— А ці звяртаеце вы ўвагу на каментарыі спажыўцоў у інтэрнэце? Напрыклад, пад артыкуламі аб закрыцці тых ці іншых аб'ектаў, на сайтах саміх крамаў, кавярняў, рэстаранаў? — пытаюся я.

— Зразумела, такая інфармацыя — не падстава для праверкі. Тут нельга выключаць і выпадкі канкурэнтнай барацьбы. Але кожны інспектар можа праверыць любы каментар асабіста, як звычайны пакупнік, — далучаецца ра замовы **Алена ЯРАШЭВІЧ, галоўны кантралёр-рэвізор аддзела кантролю па Мінску гандлёвай інспекцыі Міністэрства гандлю.**

ПРА РЭКЛАМУ, РЭЖЫМ ПРАЦЫ І ПРАДПІСАННЕ

— Вось прадпісанне на праверку вашага рэстарана, — працягвае дакументы загадчыцы гандлёвага аб'екта Наталля Васілеўская, — распішыцеся. У сваёй працы мы будзем выкарыстоўваць фотаапарат. Вось тут, калі ласка, пакіньце свае кантакты. На ўсялякі выпадак няхай будуць, бо праверка не скончыцца за адзін дзень.

Начальнік аддзела гандлёвай інспекцыі папрасіла таксама прынесці кнігу ўліку праверак і патлумачыла, што на адзін і той жа аб'ект яны могуць наведвацца да трох дзён. Здавалася б, што там шукаць на заўтра, калі сёння ўжо ўсё выявілі? Аказваецца, што-небудзь знайсці можна заўсёды!

— За два гады працы гандлёвай інспекцыі ўсяго ў некалькіх крамах не знайшлі ніводнага парушэння, з аб'ектамі грамадскага харчавання такога і ўвогуле не было, — дзеліцца Наталля Васілеўская. — Тут таксама трэба разумець, што парушэнне парушэнню не роўнае. Калі на стэндзе «Інфармацыя для спажыўца» вісіць выпіска з правілаў гандлю старой рэдакцыі — гэта адна справа, а калі вам прыносяць пратэрмінаваны тавар — зусім іншая размова, — заўважае начальнік аддзела гандлёвай інспекцыі.

Як толькі мы прайшлі далей, у прасторную ўтульную залу, члены гандлёвай інспекцыі быццам рассыпаліся і растварыліся ў рэстаране. Адны накіраваліся да барнай стойкі, другія адправіліся на кухню, трэція прыняліся вывучаць рэжым працы ўстановы. Кожны ведаў, што яму рабіць і куды ісці. Мы ж з фатографам толькі і паспявалі пераходзіць ад аднаго рэвізора да іншага.

— Вось, бачыце, у дакументе адзін рэжым працы, які ўзгоднены з адміністрацыяй раёна, а на шыльдзе — другі. Гэта ўжо парушэнне, — тлумачыць мне Алена Ярашэвіч.

Сапраўды, рэстаран самастойна падоўжыў сваю працу ў адзін з дзён тыдня на дзве гадзіны.

— У гэтай жа зале кантралёры-рэвізоры знайшлі і парушэнні, якія датычацца рэкламы, — **Уладзімір МІЛЕЎСКІ, галоўны кантралёр-рэвізор аддзела кантролю па Мінску гандлёвай інспекцыі Міністэрства гандлю,** звярнуў нашу ўвагу на невялікую шыльдачку з выявай піва ў шклянцы.

«Знайшла гандлёвая інспекцыя ўсё на той жа самай кухні і прыгатаваныя «заўтрашнім днём» прадукты. У асноўным гэта былі салаты са свежай агародніны і соусы».

— Рэклама алкаголю і цыгарэт дапускаецца толькі з папярэджаннем накшталт «Празмернае ўжыванне алкаголю шкодзіць вашаму здароўю». Тут такога надпісу, на жаль, няма, — кажа Уладзімір Мілеўскі.

Акрамя гэтага, знайшоўся і паднос з выявай гарэлкі. Словы пра шкоду здароўю тут былі, але як высветлілася, не таго памеру! Па правілах папярэджанне павінна займаць не менш за 10 працэнтаў ад плошчы ўсёй рэкламы. Уладзімір дастаў рулетку і толькі пацвердзіў свае здагадкі, што і тут ёсць парушэнні.

ПРА МАРОЗІВА, ФОТАЗДЫМКІ І АСАРТЫМЕНТ

— Згодна з асартыментным пералікам, у вас павінна быць пяць найменняў гарэлкі, два — каньяку, па тры найменні віна, сокаў і мінеральнай вады, а таксама кандытарскіх і булачных вырабаў, шакаладак айчыннага вытворцы. Пакажыце ўсё гэта, калі ласка, — звяртаецца да бармена Алена Ярашэвіч.

Тая замітусілася, і праз некалькі хвілін спецыялісты Мінгандлю ўважліва вывучалі ўпакоўкі тавараў, этыкеткі бутэлек. Некаторыя з апошніх кантралёры-рэвізоры адстаўлялі ў бок адразу, тлумачачы, што зроблены яны не ў Беларусі. Як вынік, з алкаголем усё ў парадку, а вось ласункаў і напояў айчыннага вытворцы аказалася недастаткова.

— Вось гэтыя дзве бутэлькі я фатаграфую, каб потым выкарыстоўваць здымкі як доказы парушэння,— тлумачыць свае дзеянні Наталля Васілеўская. — Белае віно пратэрмінавана на паўгода, сіроп — на месяц.

Са скончаным тэрмінам прыдатнасці там жа, у бары, знайшлося і сем шакаладак, на кухні — мята. Падазрэнне ў гандлёвай інспекцыі выклікала і партыя марозіва, якая была без накрывак, на якіх указваецца дата вырабу і тэрмін прыдатнасці. Па правілах, такая інфармацыя павінна захоўвацца да канчатковага тэрміну рэалізацыі прадукту. Як патлумачылі спецыялісты Мінгандлю, за пратэрміноўку даюць штраф у памеры ад 30 да 500 базавых велічынь. Сума залежыць ад памеру шкоды, якую той ці іншы прадукт наносіць здароўю чалавека.

Фота Надзеі БУЖАН.

Падазрэнне ў спецыялістаў Мінгандлю выклікала партыя марозіва, дата вырабу і тэрмін прыдатнасці якога невядомыя.

— Мне яшчэ патрэбны санітарныя кніжкі вашых супрацоўнікаў і пасведчанні аб адукацыі кухараў, — звярнулася да загадчыцы рэстарана Наталля Васілеўская.

Супрацоўніца Мінгандлю патлумачыла, што вельмі часта ў аб'ектах грамадскага харчавання пэўнай кухні (напрыклад, рэстаран, які мы правяралі, — ліванцаў) кухары не мясцовыя і таму не маюць патрэбнай адукацыі.

Знайшла гандлёвая інспекцыя ўсё на той жа самай кухні і прыгатаваныя «заўтрашнім днём» прадукты. У асноўным гэта былі салаты са свежай агародніны і соусы.

За дробныя парушэнні загадчык таго ці іншага аб'екта атрымлівае невялікі штраф. Калі не выконваецца асартыментны пералік, прадаюцца тавары са скончанымі тэрмінамі прыдатнасці, супрацоўнікі Мінгандлю могуць прыняць рашэнне аб прыпыненні яго працы. Закрываюць аб'екты звычайна тэрмінам на два тыдні. За гэты час установа павінна выправіць усе парушэнні і пісьмова паведаміць пра гэта супрацоўнікам Мінгандлю. У абсалютнай большасці выпадкаў да этапу паўторнай праверкі ўсе парушэнні звычайна ліквідуюцца.

За дзень на «тэлефон даверу» паступае каля дзесяці званкоў. Але спецыялісты гандлёвай інспекцыі папярэджваюць, што зварот трэба афарміць карэктна. Грамадзяніну абавязкова трэба прадставіцца, аргументавана апісаць праблему, пакінуць свае кантакты для зваротнай сувязі.

— Ведаеце, гэта яшчэ не самы горшы рэстаран, які мы правяралі. Парушэнні тут не самыя «страшныя», але працаваць, зразумела, ёсць над чым, — кажа Наталля Васілеўская.

На гэтым адна частка гандлёвай інспекцыі пакідае рэстаран, другая застаецца запаўняць мноства неабходных дакументаў аб выніках праверкі. З 31 жніўня дзейнасць рэстарана будзе прыпынена для ўстаранення парушэнняў.

Гандлёвая інспекцыя старанна правярае прадукты на якасць на кухні рэстарана.

— А ці пазнаюць вас у крамах, кавярнях, дзе вы былі ўжо з праверкамі, калі вы прыходзіце проста як спажывец? Мабыць, вас пачынаюць абслугоўваць на іншым узроўні, лепш, чым астатніх? — цікаўлюся я.

— Напэўна, не. Не заўважала я такога. Мне ўвогуле не вельмі хочацца вяртацца адпачываць туды, дзе, як я ўжо ведаю, не самы лепшы сэрвіс, — канстатуе Наталля Васілеўская.

На маё пытанне, ці праўда, што ў самых дарагіх рэстаранах і кавярнях ніколі не будзе сур'ёзных парушэнняў, начальнік гандлёвай інспекцыі толькі ўсміхнулася. Як паказвае практыка, вялікія цэны — зусім не паказчык якаснага абслугоўвання. Але, як адзначыла спецыяліст, па-сапраўднаму якасныя месцы, дзе можна перакусіць, у сталіцы знайсці можна.

Кацярына АСМЫКОВІЧ.

ДАРЭЧЫ

АСАРТЫМЕНТ АЛКАГОЛЮ ПАВЯЛІЧАНЫ, ЦЭНЫ — ЗНІЖАНЫ

Адразу дзве пастановы, прынятыя Міністэрствам гандлю ў апошні час, датычацца алкагольных напояў.

Так, згодна з адной з іх, пашыраны асартыментны пералік алкагольнай прадукцыі. Пастановай міністэрства ад 26 жніўня №24 зменены патрабаванні да рэалізацыі вінаградных він, пладовых він і натуральных пладова-ягадных він. У выпадку продажу він, у тым ліку вінаградных, суб'ект гандлю павінен забяспечыць наяўнасць він пладовых і він пладова-ягадных.

Навіна другая: нацэнка ў аб'ектах грамадскага харчавання на айчынны алкаголь будзе зніжана. Пастанова міністэрства ад 26 жніўня №25 устанаўлівае гранічную максімальную нацэнку ў памеры 60 працэнтаў (з улікам нацэнкі грамадскага харчавання, гандлёвай надбаўкі, уключаючы аптовую надбаўку) на алкагольныя напоі мацункам звыш 28 працэнтаў, што вырабляюцца і рэалізуюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, пры іх продажы ў аб'ектах грамадскага харчавання. Увядзенне абмежавання нацэнкі, тлумачаць у Міністэрстве гандлю, дазволіць знізіць цэны на алкагольныя напоі ў аб'ектах грамадскага харчавання, будзе садзейнічаць дадатковаму прыцягненню наведнікаў у гэтыя ўстановы, павысіць культуру спажывання алкаголю.

Пастановы размешчаны на сайце міністэрства і ўступаюць у сілу з моманту іх афіцыйнага апублікавання.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

Служба 101 заўсёды на сувязі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Але ж не будзем ківаць толькі на ўкраінцаў — крытыкаваць іх было б справядліва, калі б у першую чаргу нашы грамадзяне выконвалі ўсе правілы бяспечных паводзін у лесе. А гэта далёка не так. Праязджаеш па лясных сцежках, асабліва пасля выхадных, і бачыш, што шмат дзе раскідана смецце. А лес можа загарэцца нават ад шкляной бутэлькі, калі яна спрацуе як лінза... Агулам жа на экасістэмах ад пачатку года адбылося больш за 7 тысяч пажараў. Але ў нашу статыстыку трапляюць толькі тыя ўзгаранні, якія мы дапамагалі тушыць лясгасу.

«Патрэбна нейкае прынцыповае рашэнне па забеспячэнні праезду пажарнай і іншай спецтэхнікі ў двары шматпавярховай забудовы».

— Дзесьці напрыканцы мінулага года я чуў, што за выхад на слабы лёд будзе ўведзены штраф ці нейкая іншая адказнасць. Чаго ж баяцца?

— Трэба баяцца выходзіць на тонкі лёд. Такія меры мы прапануем, каб хоць нейкім чынам зменшыць людскія страты. Псіхалогія многіх людзей такая, што на страты ўласнага кашалька яны рэагуюць куды лепш, чым на папярэджанні і вербальныя ўшчуванні. Але, больш за тое, людзей, якія самахоць пайшлі на тонкі лёд і праваліліся, даводзіцца ратаваць і пасля лячыць за кошт бюджэту... Можна, вядома, паставіць засцерагальныя шыльды, аднак ці ўсе людзі звяртаюць на іх увагу? І таму прапанова штрафу — гэта не сродак зарабіць грошай, а мера, скіраваная перш за ўсё на бяспеку саміх людзей, што выходзяць на лёд.

— Механізм працы нам бачыцца наступным. Мясцовыя органы ўлады будуць мець магчымасць на мясцовым узроўні абвяшчаць забарону на выхад на лёд у залежнасці ад яго таўшчыні і трываласці.

— Праблема ёсць яшчэ ў тым, што ўпаўнаважаных людзей, якія могуць збіраць штрафы, малавата. Па асобных напрамках іх колькасць трэба павялічваць, у тым ліку і датычна вады. Напрыклад, за купанне ў забароненых месцах прыцягваюць да адказнасці толькі супрацоўнікі органаў унутраных спраў. А ў Таварыства ратавання на водах такой функцыі няма.

— Ці плануецца павялічваць адказнасць за выпальванне травы?

— Не. Давайце прааналізуем гэтую сітуацыю. Пажар травы — гэта з'ява другасная. Перш за ўсё, увагу трэба звяртаць на тое, што можа гарэць. Я маю на ўвазе засмечанасць тэрыторый. І спярша змагацца трэба менавіта з ёй. Прадстаўнікі органаў улады, ЖКГ, Міністэрства ўнутраных спраў маюць права складаць пратаколы на ўласнікаў засмечаных тэрыторый. Разам з тым весці размову аб павелічэнні штрафаў пакуль не час. Можа, іх і малавата, трэба было б больш. Але выкарыстоўваць гэты складнік пакуль можна. Ды і ўплываць на падпальшчыкаў можна і іншымі сродкамі. Напрыклад, тлумачыць ім, што калі агонь нанясе значны ўрон, то наступіць адказнасць крымінальная. А гэта ўжо сур'ёзней, чым проста заплаціць штраф.

— Ігар Валковіч, Ліда. У апошні час у Беларусі назіраецца масавая адмова ад праваднога радыё. Пры гэтым некалькі гадоў таму супрацоўнікі МНС заяўлялі, што «нічога больш эфектыўнага і надзейнага, чым правадное радыё, для давядзення інфармацыі да насельніцтва па каналах грамадзянскай абароны пакуль не прыдумана». Скажыце, калі ласка, ці бачыць МНС паўнавартасную альтэрнатыву правадному радыё? Можа быць, варта было б захоўваць існуючыя камунікацыі ў інтарэсах грамадзянскай абароны?

— Правадное радыё заўжды лічылася адным з надзейных сродкаў інфармавання. Але абарваўся провад — і як пачуць паведамленне? Ды і, сказаць па праўдзе, ці заўжды ў вас дома ўключаны правадны радыёпрыёмнік? Таму апошнія 5-7 гадоў мы паўсюль расказваем, як гучыць сірэна на вуліцы і што рабіць, калі вас заспеў гэты гук. Альтэрнатыва ж правадному радыё ёсць. Гэта перахоп FM-вяшчання. Выбраны гэты дыяпазон таму, што ён ёсць на ўсіх сучасных радыёпрыёмніках, у тым ліку ўманціраваных у тэлефоны. 99% працэнтаў тэрыторыі краіны ахоплена гэтай магчымасцю. На тэлебачанні мы можам размяшчаць бягучы радок. Ды і на самі мабільныя тэлефоны можна даволі хутка даслаць паведамленні. Праблемы з гэтым у гарадах няма. Плюс не забудземся пра нашы спецсродкі гучнай сувязі, сувязь ДАІ, іншых службаў, у якіх ёсць аўтамабілі.

— У Мінску з-за шчыльнай забудовы і павальнай аўтамабілізацыі насельніцтва ратаўнікі не заўжды могуць зручна падабрацца да месца ўзгарання. Год ад года сітуацыя толькі пагаршаецца. Раскажыце, што плануецца зрабіць для таго, каб выйсці з гэтага становішча?

— Гэтае пытанне ўжо падымалася на шматлікіх узроўнях. А ўсё адбылося з-за таго, што своечасова не прадумалі яго, не чакалі, што ў нас магчыма кратнае павелічэнне асабістага аўтатранспарту. Раней жа было як? Калі планавалі будаўніцтва

Фота БЕЛТА.

жылога дома, праектавалася пляцоўка для стаянкі аўтамабіляў, зыходзячы з таго, што 1 жалезны конь будзе на 4 кватэры. А сёння ў многіх сем'ях па дзве машыны. І вось куды іх падзець? Паркінгі і стаянкі шмат дзе далёка не поўныя. І тут ужо ролю адыгрывае менталітэт — машыну купіць нядорага, а за паркоўку заплаціць — гэта грошы ўжо непад'ёмныя. І вось як нам заехаць у двор, калі перашкаджае транспартны сродак, і выратаваць чалавека? А калі праз абы-як пастаўленае аўто мы, крый Божа, спознімся? Усім жа хочацца паставіць машыну ў крокавай даступнасці. А так, на жаль, у вялікім горадзе быць не можа. Калі толькі не павялічваць плошчу стаянак у дварах — а з іншага боку пры такім рашэнні зменшыцца плошча зялёных насаджэнняў. Шмат пустуе месцаў і ў гаражах. І знесці іх нельга, і машыны там не паркуюцца.

«Прапанова штрафу — гэта не сродак зарабіць грошай, а мера, скіраваная перш за ўсё на бяспеку саміх людзей, што выходзяць на лёд».

— За мяжой праблема вырашаецца прасцей. У Японіі, напрыклад, аўто рэгіструецца толькі пасля прад'яўлення будучым кіроўцам пасведчання аб паркоўцы. Яшчэ многія кіроўцы любяць паставіць машыну абы-як, тлумачачы гэта тым, што яны зрабілі так «на хвілінку». Зусім побач ад нас Прыбалтыка, дзе нікога не будзе цікавіць — на хвілінку ці на гадзінку вадзіцель прыпаркаваўся не па правілах. Ён тут жа атрымае істотны штраф. А ўзгадайце дыскусіі, якія разгортваліся ў сеціве падчас абмеркавання законапраекта аб канфіскацыі аўтамабіляў у п'яных кіроўцаў, калі іх лавілі другі раз на працягу года. Нягледзячы на ўсё, гэты закон быў прыняты. І што бачым? Колькасць нецвярозых за рулём паступова пачала скарачацца. Таму патрэбна нейкае прынцыповае рашэнне па забеспячэнні праезду пажарнай і іншай спецтэхнікі ў двары шматпавярховай забудовы. Падабаецца гэта камусьці або не, але тут гаворка ідзе ўжо пра чалавечыя жыцці.

— Турбуюць з Брэста. Ці прымаюць падраздзяленні Міністэрства па надзвычайных сітуацыях сапсаваныя люмінісцэнтныя лямпы? Ведаю, што дзе-нідзе такая практыка існавала. Цяпер жа ў інтэрнэце інфармацыя розная наконт яе...

— У Брэсце іх прымае, напрыклад, электралямпавы завод. У розных рэгіёнах розныя рашэнні гэтага пытання, але вы заўсёды можаце патэлефанаваць па нумары 101 і ўдакладніць, куды іх можна прынесці. Мы можам зрабіць выключэнне толькі тады, калі ў вас лямпа сур'ёзна пашкоджана. Трэба адпаведным ведамствам стварацьбольш пунктаў прыёму не толькі ў вялікіх гарадах, бо выходзіць так, што МНС — нешта накшталт панацэі ад усіх няшчасцяў. А так быць не павінна.

— Вас турбуе Алена з Барысава. Я не разумею, чаму за ліквідацыю асіных гнёздаў неабходна плаціць грошы?

— Таму што джаланосныя насякомыя будуюць свае гнёзды некалькі месяцаў. Яны не з'яўляюцца вокамгненна. А гаспадар мусіць сачыць за станам свайго жытла і іншых пабудоў. І атрымліваецца, што яго хібу павінны бясплатна выпраўляць ратаўнікі. Хаця што перашкаджала рэгулярна аглядваць куткі і гарышчы? Гэта ўсё роўна што ў лес не хадзіць (там жа таксама восы і шэршні жывуць), а выклікаць МНС на апрацоўку. Мы арганізацыя бюджэтная, і для яе вызначаны канкрэтны спіс функцый. Там, дзе ёсць рэальная пагроза, мы аказваем садзейнічанне бясплатна. Напрыклад, гэта дзіцячыя садкі, школы, дамы сацыяльнага забеспячэння.

— Сёлета ў краіне рэкордна нізкая колькасць загінулых на пажарах. Як удалося дамагчыся такой лічбы?

— Яшчэ старажытныя людзі казалі: у корані асноўных няшчасцяў, якія з намі здараюцца, ляжыць бесклапотнасць. А вось пра яе наступствы мы і тлумачым з дапамогай разнастайных формаў і метадаў уздзеяння. Разгарнулі шырокую прапаганду, наглядную рэкламу, задзейнічаем рэсурс сродкаў масавай інфармацыі. Ідзём на сельскія сходы, у школы, у дзіцячыя садкі. Але працуем мы не ў адзіночку. Нам дапамагаюць Таварыства ратавання на водах, міліцыянеры, Дзяржаўтаінспекцыя, дзіцячы пакой міліцыі, святары, кіраўніцтва мясцовых выканаўчых органаў... Вось нядаўна падпісалі пагадненне з БРСМ, дадзім моладзі неабходныя веды. І такая масіраваная агітацыя спрацоўвае! Вось не адна жанчына кажа: еду на працу і бачу шчыт, на якім выява праса, што палае. Пачынае прыгадваць, ці выключыла яна з разеткі ўсе электрапрыборы. Тэлефануе на працу, адпрошваецца на гадзіну-паўтары. Прыходзіць дадому і пераконваецца, што ўсё выключана.

Вось некалькі гадоў таму пыталіся: а навошта нам столькі рэкламы, прысвечанай бяспечнай жыццядзейнасці? Але ж паглядзіце на іншыя краіны, там яе не менш. І задарма грошы ніхто выкідваць не будзе. Асабліва калі гаворка ідзе пра жыцці людзей. Некалькі гадоў таму мы звярталіся ў інфармацыйна-аналітычны цэнтр пры Адміністрацыі Прэзідэнта для таго, каб зразумець, якія формы агітацыі лепш ужываць у розных соцыумах. Атрымалася, што для вясковых жыхароў больш падыходзяць кантактныя формы — сельскія сходы, асабістыя сустрэчы. У гарадах, дзе рытм жыцця больш шпаркі, лепш ужываць шчыты, бягучыя радкі, рэкламу на грамадскім транспарце. Мы ж хочам дастукацца да кожнага бацькі і нават дзіцяці. Вось, напрыклад, 20 гадоў назад гінула больш за 100 дзяцей на пажарах. А пазалетась гэтая лічба скарацілася ў пяць разоў!

— Раскажыце, калі ласка, пра групу рызыкі падрабязней.

— У яе ўваходзяць старыя, адзінокія пенсіянеры і сем'і з малалетнімі дзецьмі, а таксама п'яніцы і курцы. Асабліва мы заклапочаны гібеллю пенсіянераў. Вядуць некаторыя з іх сябе ўжо не вельмі адэкватна, не ва ўсіх застаецца матывацыя да жыцця. Забыўся грэлку выключыць, запалку кінуў, не пагасіў пліту. А вось у Сярэдняй Азіі, на Каўказе, у паўднёвых краінах старых людзей гіне прыкметна менш. Гэта звязана з традыцыйным грамадствам: жанчыны там, як правіла, не працуюць, іх клопат — дзеці, дом і старыя. Колькі гэта магчыма ў нас — пытанне. Яшчэ ў якасці прыкладу можна разгледзець ЗША. У 1980-я гады колькасць загінулых пенсіянераў складала 16%, цяпер дасягае 29%.

«Мы можам зрабіць выключэнне толькі тады, калі ў вас лямпа сур'ёзна пашкоджана».

— Алег Віктаравіч тэлефануе, горад Лагойск. У мяне дома праблемы з печчу. Да каго трэба звяртацца па тое, каб яе адрамантавалі або склалі новую? Наколькі я чуў, спецыялізаваныя ліцэнзіі ў печнікоў адмянілі яшчэ некалькі гадоў таму.

— Так, гэтая інфармацыя правільная. Для таго, як правільна класці печ, існуюць спецыяльныя патрабаванні. Можна, вядома, папрасіць адрамантаваць народнага ўмельца, але я б рэкамендаваў звярнуцца ў спецыялізаваную арганізацыю ЖКГ, якая працуе ў кожным раёне. Яна дае гарантыю і нясе адказнасць за сваю працу. І яшчэ дам некалькі парад па доглядзе печы. Правярайце адсутнасць шчылін, у тым ліку і на дымаходзе. Зазірніце на гарышча, паглядзіце, які стан коміна там. Пабяліце печ. Калі вы дзесьці ўбачыце сляды куродыму — значыць, там утварылася шчыліна.

— Турбуе Сяргей Бендаж з вёскі Праўцюкі Мазырскага раёна. За 800-900 метраў ад нашай вёскі размешчаны палігон цвёрдых бытавых адходаў. На ім пастаянна самаўзгараецца смецце. Каля пяці гадоў таму быў моцны пажар, які перайшоў на лес і за 100 метраў ад жылых дамоў быў ліквідаваны сіламі МНС. У ліпені быў моцны пажар, які перайшоў на лес. Верхавы пажар за 200-300 метраў да першых жылых дамоў быў спынены сіламі МНС. Калі ж гэта скончыцца?

— Праблема ёсць, узялі яе на кантроль.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. *schklennik@zviazda.by*

■ Азбука бяспекі

АСЯДЛАЎ МАТАЦЫКЛ — НАДЗЕНЬ ШЛЕМ!

Сталічная Дзяржаўтаінспекцыя ўзмоцніць кантроль за кіроўцамі мотатранспарту.

— Рэйды па выяўленні парушэнняў Правіл дарожнага руху інспектары будуць праводзіць як у дзённы, так і ў начны час сутак, — паведаміла **кіраўнік прэс-службы ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Таццяна ХАРЛІНСКАЯ.** — З пачатку года ў сталіцы з удзелам двухколавых транспартных сродкаў адбылося 18 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх два чалавекі загінулі, 18 атрымалі раненні рознай ступені цяжкасці. Асноўнымі прычынамі дарожнага траўматызму і смяротнасці можна назваць парушэнне правіл манеўравання, праезд на чырвоны сігнал святлафора, няправільны выбар хуткасці руху. Чым вышэй хуткасць, тым менш шанцаў зрэагаваць на перашкоду, якая ўзнікае на дарозе. Часта можна гаварыць і пра недастатковы вопыт кіравання гэтым відам транспарту. Нямала ДТЗ з матацыклістамі адбылося і па віне кіроўцаў аўтамабіляў, таму ўважлівымі патрэбна быць усім удзельнікам дарожнага руху.

ТРЭБА ВЕДАЦЬ

Дзяржаўтаінспекцыя нагадвае, што кіраваць матацыклам неабходна ў шлеме. Апроч таго, шлем павінен быць і на пасажыры. Для прыцягнення да сябе ўвагі на дарозе байкерам рэкамендуецца рухацца з пастаянна ўключаным бліжнім святлом фар. Таксама ўладальнікам мотатэхнікі неабходна паклапаціцца пра своечасовую рэгістрацыю транспартных сродкаў і праходжанне тэхагляду.

Сяргей РАСОЛЬКА

КАБ ПОЛЫМЯ НЕ ЗАВІТАЛА Ў ШКОЛУ

Падрыхтоўку школ да чарговага навучальнага года емагчыма ўявіць без супрацьпажарнага рэйду. І гэта дае плён — калі ў 2003 годзе тушыць пажары ў школах даводзілася ажно 14 разоў, то сёлета такая дапамога спатрэбілася ўсяго аднойчы...

— Практычны вопыт паказвае, што кантроль за станам пажарнай бяспекі неабходна ўзмацніць, як і саму сістэму падрыхтоўкі адказных за яе, — лічыць **першы намеснік начальніка ўпраўлення нагляду і прафілактыкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Уладзімір СУВОРАЎ.** — Толькі сёлета за яе неналежны стан да адміністрацыйнай адказнасці мы прыцягнулі 1156 кіраўнікоў і 236 адказных асоб. Парушэнні ўжо даўно сталі звыклымі: сапсаваліся тэхнічныя сродкі супрацьпажарнай абароны, замкнуты дзверы на шляху эвакуацыі, загрувашчаны мэбляй праходы...

Разам з тым парушэнняў, з-за якіх трэба было б прыпыніць працу школ, інспектары не выявілі. Пры гэтым асабліва пільная ўвага надавалася ўстановам адукацыі, размешчаным у глыбінцы. Нават дагэтуль 54 школы ацяпляюцца ўзімку печкамі...

— Аналіз пажараў, якія адбыліся ў школах за апошнія 13 гадоў, паказвае, што больш за 80% з іх адбылося з-за чалавечага фактару, — сцвярджае Уладзімір Суворaў. — А каб яго папярэдзіць, шмат сродкаў не патрабуецца, дастаткова толькі выконваць існуючыя правілы бяспекі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

■ Ну і ну!

ГОСЦЮ ЧАКАЎ РАСПАЛЕНЫ ПРАС...

Праваахоўнікі з Савецкага РУУС сталіцы затрымалі мужчыну, які спрабаваў вярнуць свае грашовыя сродкі ў стылі «ліхіх 90-х» пры дапамозе... распаленага праса.

— У дзяжурную часць Першамайскага райаддзела міліцыі пазваніла жанчына, якая сцвярджала, што яе дачка вярнулася дадому са слядамі апёкаў на целе. На пытанне маці пра іх паходжанне апошняя распавяла, што была ў гасцях у знаёмага, які пражывае па вуліцы Мірашнічэнкі, — паведаміла «Звяздзе» **прэс-афіцэр Савецкага РУУС г. Мінска Аляксандра ПАПОВА.** — Дык вось той мужчына западозрыў госцю ў крадзяжы грошай з кватэры. І паспрабаваў вярнуць іх пры дапамозе распаленага праса. «Негасцінны» гаспадар затрыманы. Заведзена крымінальная справа па артыкуле «Катаванне», які прадугледжвае пакаранне ў выглядзе арышту на тэрмін да трох месяцаў ці абмежавання волі тэрмінам да трох гадоў або пазбаўлення волі на той жа тэрмін.

Сяргей РАСОЛЬКА

Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» ОКАЗЫВАЕТ УСЛУГИ ПО:

- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
- организации и проведению аукционных торгов
- инвентаризации и оценке зеленых насаждений

ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 17 сентября 2015 г. в 11.30 состоятся открытые аукционные торги по продаже имущества, обращенного в доход государства, в составе Лота № 1 (предмет торгов):

Наименование и адрес предмета торгов (Лот № 1):	**Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-15120 (квартира № 313) общ. пл. 111,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Максима Горького, д. 41**
Организатор торгов	Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509 (220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, МФО 153001369)
Место проведения торгов и подачи документов	г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация»
Начальная цена продажи	961 634 200 рублей, размер задатка – 10%, что составляет 96 163 420 рублей
Номер расчетного счета для перечисления задатка	Получатель платежа – Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска, код 153001369
Характеристика текущего состояния предмета торгов	Квартира находится в кирпичном многоквартирном доме с электроснабжением, централизованным отоплением, газоснабжением, холодным и горячим водоснабжением, канализацией, год постр. – 1983. Кол-во комн. – 3, этаж расположения 9-10, площадь кухни (столовой) – 37,1 кв.м, санузел совм., высота потолков – 2,47, в стадии ремонта. В квартире перепланировка не оформлена в установленном законодательством порядке. До перепланировки общая площадь квартиры составляла 99,6 кв.м, кол. комн. – 4
Условия продажи	Проведение победителем аукционных торгов работ по восстановлению перепланировки и переустройства в части изоляции отапливаемого помещения квартиры от летнего помещения лоджии и переноса сетей отопления
Срок и условия оплаты за приобретенное с торгов имущество	В течение 80 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на счет Организатора торгов разовым платежом либо траншами
Срок подачи документов, осмотра предмета торгов и внесения задатка	по 11 сентября 2015 г. включительно до 16.00

Порядок проведения торгов: Шаг аукциона определяется в размере от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Задаток, внесенный Победителем торгов (Претендентом на покупку) будет зачтен в счет окончательной стоимости приобретенного имущества, остальным участникам будет возмещен в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. **В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов**.

Организатор торгов (по письменному указанию соответствующей комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства) вправе снять предмет торгов с торгов в любое время до объявления его проданным.

Победитель (Претендент на покупку) возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней со дня проведения торгов в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон.

****Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Звязда» от 15 июля 2015 г.**

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 30 сентября 2015 года повторных торгов по продаже конфискованного имущества

Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение, продаваемого имущества)	- капитальное строение с инвентарным номером 614/С-25044, площадью 229,4 кв. м (наименование: садовый домик; назначение: садовый домик), расположенное по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, садоводческое товарищество «Орешники»; - земельный участок с кадастровым номером 624883000020000062, площадью 0,0640 га (назначение: земельный участок для коллективного садоводства), расположенный по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, садоводческое товарищество «Орешники»; - земельный участок с кадастровым номером 624883000020000063, площадью 0,0488 га (назначение: земельный участок для коллективного садоводства), расположенный по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, садоводческое товарищество «Орешники»
Начальная цена	358 270 400 белорусский рублей
Сумма задатка	35 800 000 белорусских рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится 30 сентября 2015 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 10.09.2015 по 28.09.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 29 сентября 2015 г. повторных торгов по продаже конфискованного имущества

Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение (жилой дом с постройками), расположенное на земельном участке №625082302601000016 по адресу: Минская область, Солигорский район, Краснодворецкий сельский совет, аг. Краснодворцы, пер. Садовый-1, д. 8 (площадь земельного участка 0,2492 га)
Начальная цена	370 710 000 рублей
Сумма задатка	37 000 000 рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Для участия в аукционе по нескольким предметам торгов необходимо внести задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится 29 сентября 2015 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 07.09.2015 по 25.09.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 28 сентября 2015 г. повторных торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)	Капитальное строение (здание картофелехранилища 1975 года постройки, кирпичное одноэтажное, после реконструкции 2008 года общей площадью 3638 кв.м инвентарный номер в ЕГРНИ 644/С-38132), назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ
Сведения о земельном участке	Здание расположено на земельном участке 625000000012001704 площадью 2,3832 га
Местонахождение имущества	Минская обл., Солигорский р-н, ст. Калий-1
Начальная цена	8 835 382 800 рублей
Сумма задатка	883 000 000 рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10
Балансодержатель (должник)	Коммунальное торговое унитарное предприятие «Солигорский горплодовощторг», г. Солигорск, ул. Северная, 6

Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Для участия в аукционе по нескольким предметам торгов необходимо внести задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится 28 сентября 2015 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 07.09.2015 по 24.09.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».

■ Цяжкасці выхавання

З «КАЗЁННАГА» ДОМА — У РОДНЫ

У Мінску закрыты ўсе школы-інтэрнаты, а колькасць дзіцячых дамоў значна скарацілася

Гэта вынік сумеснай міжведамаснай працы па выкананні Дэкрэта Прэзідэнта №18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у сацыяльна небяспечных сем'ях». Асноўная яго мэта — не дапусціць умоў, калі дзяцей разлучаюць з бацькамі. Калі ж здараецца, што дзіця неабходна забраць з сям'і, то малых стараюцца адправіць на сямейную форму ўтрымання, а не ў інтэрнатную ўстанову, пры гэтым для бацькоў захоўваецца магчымасць аднавіцца ў сваіх правах.

Зінаіда ВАРАБ'ЁВА, загадчык сектара сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама, расказала карэспандэнту «Звязды» пра разнастайныя формы працы з дзецьмі, якія засталіся без бацькоўскай апекі:

— Давайце, Зінаіда Васільеўна, разбяромся спачатку з самім тэрмінам «сацыяльнае сіроцтва»...

— Найперш за ўсё гэты тэрмін, да якога мы ўсе прывыклі, не адпавядае закладзенаму ў яго сэнсу, і мы пэўным чынам дэзынфармуем грамадскасць. Сіроты — дзеці, у якіх няма ў жывых ніводнага з бацькоў. Такіх у Беларусі (з улікам паўналетніх, што яшчэ вучацца ў розных навучальных установах і знаходзяцца на дзяржаўным утрыманні) — 5 674 чалавекі. Астатнія 22 940 дзяцей (і асоб з іх ліку, якія афіцыйна таксама адносяцца да сіроцкай катэгорыі) маюць бацькоў. Для такіх непаўналетніх з'явіўся добры тэрмін «патрабуюць дзяржаўнай абароны» (ПДА). Гэтая абрэвіятура найбольш поўна акрэслівае становішча дзіцяці.

За 10 гадоў у сталіцы ўтрая зменшылася лічба дзяцей, адабраных у грамадзян, якія страцілі свае бацькоўскія правы. У 2004-м — гэта 647 дзяцей, у 2014-м — 210. Больш чым на траціну знізілася колькасць малых, накіраваных жыць у інтэрнат. Дынаміка відавочная: у 2009 годзе новыя сем'і былі знойдзены для 63 дзетак са 100 асірацелых, у 2014-м — для 84. Толькі 14% малых летась трапілі ў мінскія інтэрнаты. Мінчане ў мінулым годзе ўсынавілі 116 дзяцей (у 2013-м — 82).

«Распаўсюджаны выпадкі, калі бабуля-дзядуля жадаюць забраць на выхаванне ўнукаў пасля пазбаўлення бацькоўскіх правоў. Напрошваецца пытанне: вы не змаглі выгадаваць нармальнага чалавека са свайго дзіцяці — як жа справіцеся з унукам?»

Формаў уладкавання дзіцяці ў сям'ю шмат. Гэта ўсынаўленне, апека, прыёмныя сем'і, дзіцячыя дамы сямейнага тыпу (ДДСТ), дзіцячы гарадок Ленінскага раёна Мінска. Найбольш распаўсюджана ў нас апякунства. Апекунамі становяцца праз спрошчаную адміністрацыйную працэдуру. Не трэба праходзіць адпаведнага навучання, тут не ўлічваецца ўзрост (усынавіцель, напрыклад, павінен быць старэйшым за дзіця не больш як на 45 гадоў). Каб дзіця было абаронена, трэба стварыць аднолькавыя строгія ўмовы для ўсіх формаў.

— На вашу думку, якая форма ўладкавання ў сям'ю найлепшая і больш бяспечная для дзіцяці?

— Усе формы добрыя, калі ствараюцца якасныя ўмовы для жыцця малых. Непаўналетніх павінны выхоўваць у першую чаргу падрыхтаваныя для гэтага людзі. Пакуль самыя дасведчаныя ў гэтым плане — супрацоўнікі інтэрнатных устаноў. Там выхавальнікі маюць вопыт, адпаведную адукацыю, а некаторыя і не адну.

Пры стварэнні дзіцячага дома сямейнага тыпу падбіраюцца бацькі-выхавальнікі, якія таксама маюць вопыт выхавання ўласных дзяцей, ужо працавалі прыёмнымі бацькамі сірот, ведалі аб ранейшых умовах жыцця малых. Прыёмныя бацькі праходзяць спецыяльны курс, павышаюць сваю кваліфікацыю, органы апекі суправаджаюць і кантралююць замяшчаючыя сем'і, правяраюць, як жывецца дзіцяці.

У Мінску існуе 46 дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, якія ствараюцца найперш для таго, каб не разлучаць дзяцей з адной сям'і. У кожным з дамоў — ад 5 да 10 выхаванцаў, але бывае і больш, калі ў дзяцей знаходзяцца браты і сёстры ў другой мясцовасці. Спецыфіка сталіцы не дае магчымасці такім сем'ям жыць у катэджах з кавалкам зямлі, як, напрыклад, на перыферыі. У нас гэта некалькі кватэр, аб'яднаных у адну, у звычайных «панэльках». Толькі тры памяшканні знаходзяцца ў элітных будынках у двухузроўневых кватэрах.

— Напэўна, падчас працы з бацькамі і апекунамі вы сутыкаецеся з шэрагам праблем?

— Так. Думаецца, што ў нас крыху спрошчаная працэдура апякунства. Праз сацыяльна-педагагічныя цэнтры (СПЦ) мы праводзім дыягностыку кандыдатаў, а гэта падабаецца далёка не ўсім. Працэдура неабавязковая, але мы настойваем на ёй і лічым, што яе трэба ўзаконіць ва ўсёй краіне, каб дзіця не трапіла ў горшыя ўмовы. Таксама неабходна ўводзіць курс падрыхтоўкі апекуноў да выхавання сваіх падапечных. Нездарма ж выпадкаў разусынаўлення ў Беларусі адзінкі (2 па Мінску, 18 — па Беларусі), а вось з-пад апекі штогод выходзіць значная колькасць дзяцей, бо часам апекуны не спраўляюцца з падрослымі дзецьмі. Вось і ўявіце, як павінна адчуваць сябе дзіця, якое з 4-5 гадоў жыло ў сям'і сваякоў, а ў 13-15 апынулася ў інтэрнаце.

Распаўсюджаны выпадкі, калі бабуля-дзядуля жадаюць забраць на выхаванне ўнукаў пасля пазбаўлення бацькоўскіх правоў. Напрошваецца пытанне: вы не змаглі выгадаваць нармальнага чалавека са свайго дзіцяці — як жа справіцеся з унукам? З другога боку, іх заўжды шкада. Вось адна бабуля ў нас зараз хоча ўнучку забраць да сябе. А як мы можам гэта дазволіць, калі там жа прапісана і жыве яе бяспраўная маці-наркаманка? Па заканадаўстве, у адным памяшканні не могуць жыць чалавек, пазбаўлены бацькоўскіх правоў, і дзіця пад апекай. Бабуля можа працягваць бачыцца з унучкай, нават калі тая будзе ўладкавана пад апеку ці ў прыёмную сям'ю.

— Дамы-інтэрнаты плануецца закрыць, каб у Беларусі не засталося сіротаў. Як праходзіць гэты працэс?

— Колькасць інтэрнатных устаноў скарацілася напалову, але нельга закрыць іх усе, таму што ёсць катэгорыя дзяцей, якія не запатрабаваны сем'ямі — з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, ВІЧ-інфіцыраваныя, тыя, хто мае асаблівасці паводзінаў, падлеткі, якія самі не хочуць жыць у чужой сям'і. Да таго ж, у інтэрнатах працуюць высокакваліфікаваныя педагогі-прафесіяналы, якія здольныя выхаваць дзіця і падрыхтаваць яго да дарослага жыцця.

— Як жа дапамагчы пасталеўшым выхаванцам інтэрнатаў не згубіцца ў дарослым жыцці?

— Найперш за ўсё патрэбна стварыць умовы, каб гэтыя дзеці мелі магчымасць набыць першасныя прафесійныя навыкі. Гэта дапаможа ім вызначыцца, кім яны жадаюць быць. Магчыма, трэба на нейкім узроўні замацаваць сістэму ўзаемадзеяння прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў з інтэрнатамі.

Дарэчы, ад назвы «дзіцячы дом» таксама час пазбаўляцца. Пераўтварыць яе, скажам, у «цэнтр дапамогі сям'і» або «цэнтр дапамогі дзецям, якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі». Гэта дапаможа не навешваць на падлеткаў ярлыкі, да якіх яны прывычайваюцца.

— Ці магчыма, Зінаіда Васільеўна, так удасканаліць працу, каб у Беларусі не было «нічыйных дзяцей»?

— Неабходна актывізаваць прэвентыўную працу з небяспечнымі сем'ямі і ўзмацніць міжведамасную дапамогу дзецям і сем'ям, што знаходзяцца ў сацыяльна-небяспечным становішчы. Працу з такімі бацькамі трэба наладжваць, каб прымусіць іх усвядоміць і прыняць на сябе адказнасць за выхаванне і ўтрыманне дзяцей. Найлепшы эфект ад прафілактычнай працы, калі малыя вяртаюцца дадому, а яшчэ лепш — не пакідаюць яго.

Увогуле, з сям'ёй трэба працаваць яшчэ да нараджэння дзіцяці, каб яно было жаданым. Часам трэба і своеасаблівую «інтэрвенцыю ў сям'ю» ажыццяўляць, каб своечасова заўважыць праблему, папярэдзіць яе, каб дзіця засталося не проста ў сям'і, а ў якасных умовах з нармальнымі бацькамі. Добра было б пераняць замежны вопыт, калі сям'ю, пачынаючы ад рэгістрацыі ў ЗАГСе, яшчэ гадоў 5 суправаджаюць спецыялісты (псіхолагі, псіхіятры). Запрашаюць маладых на мерапрыемствы, лекцыі, падчас якіх людзі атрымліваюць веды, а спецыялісты вывучаюць паводзіны бацькоў, іх адносіны і стаўленне да дзяцей. Людзі прызвычайваюцца да гэтага і ўспрымаюць як нармальную практыку.

Ірына СІДАРОК.
Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА

■

За 10 гадоў у сталіцы ўтрая зменшылася лічба дзяцей, адабраных у грамадзян, якія страцілі свае бацькоўскія правы. Больш чым на траціну знізілася колькасць малых, накіраваных жыць у інтэрнат. Дынаміка відавочная: у 2009 годзе новыя сем'і былі знойдзены для 63 дзетак са 100 асірацелых, у 2014-м — для 84. Толькі 14% малых летась трапілі ў мінскія інтэрнаты. Мінчане ў мінулым годзе ўсынавілі 116 дзяцей.

■ Нефармат

СВАЁЙ БАЯЗЛІВАСЦІ ТРЭБА БАЯЦЦА

Тэлефаную ў адну арганізацыю, каб дамовіцца пра сустрэчу, мэтай якой будзе напісанне матэрыялу. «Пачакайце, — раздаецца на тым канцы, — трэба ўзгадніць з кіраўніцтвам, вось вам тэлефон намесніка па ідэалогіі». Набіраю прапанаваны нумар — гаспадар кабінета адказвае вельмі ветліва, але просіць пазваніць заўтра, бо, на яго думку, трэба праінфармаваць дырэктара, а то неяк няёмка атрымаецца, субардынацыя і ўсё такое. Спрабую патлумачыць, што мяне цікавіць адно канкрэтнае пытанне, я не збіраюся праводзіць глыбіннае даследаванне на прадмет эфектыўнасці функцыянавання іх установы. «Ну тады вы, можа, у пісьмовай форме накіруеце запыт, а мы адкажам», — спрабую «саскочыць» ідэолаг. Гавару, што матэрыял тэрміновы, што я не прашу звестак, якія змяшчаюць ваенную альбо дзяржаўную тайну, яшчэ нешта ў гэтым родзе... І ўсё ж мне настойліва рэкамендуюць пачакаць яшчэ дзень, а лепш за ўсё — набраць у панядзелак, бо начальства недзе ад'ехала і сёння наўрад ці будзе.

Урэшце набіраю першы тэлефонны нумар, па якім званіла, і пытаю ў жанчыны «не для друку» прычыну такой канспірацыі. Яна не ўтойвае, што пытанне, якое я задаю — «капеечнае» для спецыяліста яе ўзроўню, яна расклала б па паліцах усё за чвэрць гадзіны. Але ёй засталося пару гадоў да пенсіі, якія пажадана дапрацаваць. А калі начальству стрэліць у галаву, што яна парушыла субардынацыю альбо не ўключыла працэс узгадненняў, якія яно так любіць, то ёй можа быць дрэнна. Бо аднойчы было, што адзін кіраўнік аддзела пагаварыў з журналістам, а дырэктару не спадабалася з газетнай цытаты адна фраза з лічбай. Той паказчык кіраўнік, аказваецца, не хацеў агучваць, бо баяўся рэакцыі вышэйшага начальства. «Што было, успамінаць не хочацца».

— А чаго вы здзіўляецеся? — гаворыць мая суразмоўца. — Што, у нас адных так? Не так даўно ў нашай супрацоўніцы сын у школе атрымаў траўму. Дык да іх прыходзілі, на прамілы бог прасілі, каб у паліклініцы сказалі, што хлопчык вывіхнуў руку ў дварэ дома. Яны так і зрабілі. Настаўнікаў шкада, іх жа зацягаюць з напісаннем тлумачальных запісак, разборамі і пакараннямі. Нібы некаму невядома, што дзеці бегаюць, часам падаюць, б'юць насы. І ніхто не застрахаваны ад сінякоў, драпін, а то і пераломаў.

І з ёю даводзіцца пагадзіцца. У нас вельмі любяць шукаць таго, каго можна пакараць. Гэта, відаць, падсвядомае, а можа, і свядомае імкненне апярэдзіць і зняць з сябе адказнасць. І як вынік, жаданне патэнцыяльнай ахвяры замаўчаць альбо наогул паказаць сітуацыю крышачку інакш. Як расказваюць ветэраны-вайскоўцы, з гэтага менавіта і пачыналася дзедаўшчына ў арміі. Ніякаму камандзіру не хацелася, каб яго падраздзяленне запісвалі ў адстаючыя, а самога лаялі на нарадах, а то і накладвалі спагнанні. Таму брыдкія ўчынкі асобных ваеннаслужачых не атрымлівалі заслужанай ацэнкі, не выкараняліся адразу. І, па сутнасці, злачыннасць атрымала распаўсюджанне. Потым доўга і балюча давялося яе выкараняць. І то тут, то там адгалоскі гэтай з'явы перыядычна даюць пра сябе знаць: то ў асяродку навучэнцаў прафтэхвучылішчаў, то ў іншых юнацкіх калектывах.

Адзін раз баімся папсаваць статыстыку, другі раз — імідж, потым прывыкаем баяцца. Тую боязь давялося згадаць не раз, пакуль рыхтавала матэрыял пра гісторыю сям'і інвалідаў з Івацэвіч, у якой маглі забраць дзіця. Маці спраўляецца з доглядам немаўлятку, але яна інвалід першай групы. І жалезным аргументам некаторых чыноўнікаў становіцца пасыл: «Раптам што здарыцца з вашым дзіцем, некаму тады давядзецца адказваць». А чаму нехта мусіць адказваць, скажам, за няшчасны выпадак? У нашай вобласці за час спякоты трое дзяцей выпала з вокнаў, некалькі малых патанулі на вадаёмах. Ніхто ж за гэта не адказваў, бацькі і так ужо пакараны няшчасцем.

У адной сям'і, дзе маці — журналістка, а бацька — выкладчык, шмат гадоў таму трохгадовы сын выпіў бутэлечку лякарства ад насмарку і трапіў у рэанімацыю. Як вы, відаць, зразумелі, гавару зараз пра сябе. Колькі здароўя каштавала мне тая яго ноч у рэанімацыі, пра гэта асобная размова. Але ж не пазбавілі мяне бацькоўскіх правоў, не пакаралі ўчастковых медыкаў за недастатковую прафілактычную работу. І хлопец, дзякаваць Богу, вырас. Я да таго, што няшчасныя выпадкі, надзвычайныя здарэнні з дзецьмі бываюць ва ўсе часы і ва ўсіх краінах. І што тут баяцца загадзя? Лепей усё ж спадзявацца на лепшае, каб, як той казаў, не накаркаць.

...Гадоў дзесяць таму давялося праведваць у бальніцы каляжанку пасля аперацыі з нагоды апендыцыту. Дык вось яна сказала, што ўсё жыццё амаль што панічна баялася апендыцыту. «Можа, таму ён і здарыўся», — горка пажартавала жанчына. А калі аперацыя прайшла і праз колькі дзён ачомалася, то зразумела, што не варта было баяцца. Гэта я да таго, што мы самі нярэдка становімся крыніцай розных страхаў, а яны потым вырастаюць, набіраюць сілу і становяцца традыцыяй грамадства.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

■

■ Узровень-40

МАЕ НАСТАЎНІКІ

Хочаце верце, хочаце не, але мяне, першакласніка, вельмі здзівіла навіна пра тое, што наша першая настаўніца трымае... карову. Хаця мы жылі ў адным пасёлку, нават непадалёк, у яе сям'і быў такі ж драўляны дом, участак з садам і агародам, як і ва ўсіх навокал. І гэта не выклікала ніякіх эмоцый у адрозненне ад навіны пра рагулю. Я пэўны час не мог суаднесці, як вось гэтая строгая жанчына, што вучыць нас пісаць і лічыць, заўсёды размаўляе ў класе добра пастаўленым голасам і ходзіць толькі ў дзелавых строях, пасля працы ў школе выпраўляецца з вядром у хлеў ці на луг даіць карову... Мабыць, такі «злом» дзіцячай свядомасці быў ад таго, што некалі да настаўнікаў ставіліся, скажам так, некалькі інакш, чым цяпер. Гэтак жа, як і адносіны педагогаў, асабліва старой савецкай школы, да вучняў таксама адрозніваліся ад сённяшніх. Было ўсё тое ў самым канцы 1970-х гадоў...

СВАЮ першую школьную лінейку я, калі шчыра, не памятаю. У мяне засталося нейкае агульнае ўражанне ад некалькіх «першых званкоў» пачатковага перыяду навучання. Хіба толькі яскрава запомніўся вялікі букет вяргіняў, што зразаліся напярэдадні 1 верасня на агародзе ў цёткі. А ў панядзелак у метро бачыў малечу, якая несла на «першы званок» жывыя архідэі... І штосьці мне падказвае, што настаўніца не адмовіцца ўзяць гэты прэзент. Я нікога не абвінавачваю, але прашу не абвінавачваць і мяне. Проста ў час, калі ў школу пачало хадзіць наша пакаленне, некаторыя рэчы былі немагчымы як з боку настаўнікаў, так і з боку бацькоў вучняў...

МОЖА, у мяне няма асаблівых уражанняў ад пачатку навучальнага года з прычыны таго, што ўсё раней было падобным з года ў год? Яшчэ летам маці з бацькам аднойчы прыносілі дадому з крамы на дваіх з братам па сто сшыткаў у клетачку і лінейку (частка з іх пераходзіла на наступны навучальны год), ручкі, алоўкі, вокладкі. Купляліся новая спартыўная форма, абавязкова кеды (бо іх хапала толькі на год і якраз напярэдадні новага навучальнага года яны даношваліся) і школьная форма, калі з папярэдняй вырастаў. Такой колькасці кірмашоў, як цяпер, не было, як і таго багацця выбару тавараў да школы, таму ўсё набывалася адносна хутка і асаблівых эмоцый не пакінула. Не памятаю вялікіх пакут ад прымерак, тым больш што бацькі многае маглі набыць і без нашай прысутнасці. Гэта мы зараз гаворым

Падчас урока матэматыкі хлопцы на поўную магутнасць уключылі на магнітафоне вельмі папулярную тады песню «Фаіна» групы «На-на». Дык настаўніцы Фаіне Ізраілеўне нават спадабалася...

пра падрыхтоўку да школы ў сэнсе набыцця формы і канцылярскіх тавараў. А яшчэ можна сказаць пра падрыхтоўку іншую. Цяпер большасць дзяцей ідуць у першы клас, не толькі ўмеючы чытаць і лічыць, але і ўжо з пачатковым веданнем замежнай мовы, пасля наведвання розных развіццёвых гурткоў і секцый, ледзьве не пачатковых школ для адораных. Калісьці нас перад школай таксама вучылі чытаць і лічыць, але вялікага фанатызму з боку бацькоў я не памятаю. У адных дзяцей тое атрымлівалася лепш, у іншых — крыху горш, але агульная пазіцыя дарослых была прыкладна такой: на тое яна і школа, каб усяму навучыць.

ЗАПОМНІЛАСЯ іншае. У дзіцячы садок я не хадзіў (дарэчы, у тыя часы гэта не лічылася нечым выключным, ведаю, што дастаткова маіх равеснікаў таксама не зведалі плюсаў і мінусаў дзетсадаўскіх сняданкаў і «ціхіх гадзін»), таму быў, можна сказаць, дзікім дзіцем. У школе мне з гэтай прычыны не падабалася. Напачатку — вельмі. І я ўцякаў з яе. У прамым сэнсе словы. Маці ці бацька адвядзе мяне на заняткі, а я праз нейкі час — назад. Памятаю, ідуць урокі, у калідорах цішыня. На першым паверсе каля гардэроба мы сядзім утрох: я, маці і завуч. Дакладней, сяджу я, а яны стаяць насупраць мяне і ўгаворваюць пайсці вучыцца... Каб спыніць уцёкі, настаўніца прызначыла аднаго аднакласніка прыглядаць за мной. Але хіба гэта перашкода? Папрасіўся выйсці ў прыбіральню — і толькі мяне і бачылі! Так «газануў», што тапкі ў бакі паадляталіся, аднакласнік недзе ззаду застаўся. Нават

Працуе экзаменацыйная камісія.

Так глядзець на свет можна толькі ў пачатку школьнага жыцця.

маці паспеў дагнаць, якая да дому яшчэ не дайшла... Калі на апошнім званку ўручалі дыпломы і граматы за поспехі ў вучобе, першая настаўніца прыгадала тыя мае ўцёкі. Пасмяяліся ўсёй школай...

ПАКРЫСЕ ўсё наладзілася. У малодшых класах я быў камандзірам акцябрацкай «зорачкі», потым, як і ўсе, піянерам. Памятаю, колькі ў нас з аднакласнікамі было гонару, калі мы пасля ўрачыстага прыняцця ў шэрагі тых, хто «заўжды гатовы», выскачылі на яшчэ сцюдзёны школьны двор (тады ж у піянеры прымалі бліжэй да дня нараджэння Леніна) без паліто і шапак, як красаваліся адно перад адным чырвонымі гальштукамі... У сярэдніх класах давялося пабыць палітінфарматарам. Тлумачу для сённяшняй моладзі: гэта быў спецыяльна прызначаны ў класе вучань, у абавязкі якога ўваходзіла рэгулярная падрыхтоўка, як бы сказалі зараз, агляду перыядычнага друку — падзеі ў Гандурасе ці Нікарагуа, тагачасная праграма САІ (стратэгічнай абарончай ініцыятывы ЗША, абвешчанай прэзідэнтам Рональдам Рэйганам), розныя іншыя цікавыя падзеі. Уся гэтая інфармацыя збіралася ў адмысловы сшытак, па ім потым трэба было зрабіць даклад, а пасля адказаць на пытанні аднакласнікаў ці настаўніцы па тэме. Пазней усе мы вучылі, што такое «дэмакратычны цэнтралізм» і ўступалі ў камсамол. Шчыра скажу, такога гонару, як пры прыняцці ў піянеры, ужо не было. Хаця ў выпускным класе выпрабаваў на сабе ролю камсорга школы.

ДВА апошнія гады давялося давучвацца ўжо ў новай школе. І сам будынак вельмі падабаўся, і большасць настаўнікаў, і іх стаўленне да нас. І хаця мы раз-пораз чулі, што, маўляў, пакаленне ўжо не тое, думаю, насамрэч гэта было не так. Прынамсі, адпетых хуліганаў на школу было — раз-два і ўсё. Якую шкоду маглі ўчыніць? Хіба толькі зрэдку кнопку падкласці на крэсла ды дошку ў класе парафінам намазаць. Яшчэ прыгадваю, як раз ці два нехта «дымавуху» з лінейкі недзе ў прыбіральні спаліў. Неяк у братавым класе падчас урока матэматыкі хлопцы на поўную магутнасць уключылі на магнітафоне вельмі папулярную тады песню «Фаіна» групы «На-на». Дык настаўніцы Фаіне Ізраілеўне нават спадабалася... Каб «троліць» настаўнікаў, як гэта можна цяпер часта назіраць у сецыве, такога нават блізка не было! Што той інтэрнэт, калі сярод знаёмых і калег хапае колішніх настаўнікаў, якія такое могуць расказаць пра норавы сучасных школьнікаў! Прынамсі, так было яшчэ зусім нядаўна, калі з навучальных устаноў многія беглі, як ад агню...

ХАЦЯ і ў наш час бывала, вядома, рознае, але тое былі дробязі, якія, тым не менш, фарміравалі характар, права адстойваць сваю пазіцыю. У дзявятым класе настаўнік рускай мовы і літаратуры сказаў ехаць на раённую алімпіяду. Я адмовіўся, бо мне гэта было зусім нецікава і непатрэбна. Пачуў, што тады па заканчэнні школы буду мець у атэстаце чатыры балы па прадмеце. Пры такім раскладзе я тым больш сказаў сваё катэгарычнае «не». Мы абодва выканалі свае абяцанні... Неяк класам рыхтавалі пастаноўку для ўдзелу ў аглядзе мастацкай самадзейнасці. Я і сёння не люблю такую публічнасць, таму не захацеў іграць нейкую ролю. Класная кіраўніца, якая вяла ў нас яшчэ і хімію, выгнала за гэта з класа. А потым, калі на апошнім званку мы пакідалі адно аднаму нейкія пажаданні, яна нечакана для мяне напісала: «Сярожа, мой любімы вучань! Будзь заўсёды такім, і шчасце цябе знойдзе...» (Надзея Васільеўна, калі чытаеце гэтыя радкі, прывітанне!). Нейкія рэчы я і зараз зразумець не магу, думаю, непадуладнымі яны будуць і розуму сённяшніх маладых людзей. Аднойчы — першы і апошні раз за дзесяць гадоў — дадому завіталі дзве настаўніцы, каб праверыць бытавыя ўмовы вучня. «Што робіш?» — пытаюцца. «Ды вось, — адказваю, — заўтра справаздачна-выбарны камсамольскі сход. Выступленне да яго пішу». Назаўтра «навіна» пра тое, што камсорг піша даклад напярэдадні сходу стала вядомай усёй школе і прагучала як нейкае абвінавачванне. Вы зараз, напэўна, усміхнуліся ці пацяснулі плячыма, але такім было савецкае мінулае...

ПАМЯТАЮ, што ў старэйшых класах да нас ставіліся, як да дарослых, асабліва гэта адчувалася з боку настаўнікаў-мужчын, калі яны давалі нейкія даручэнні. Адмовіць было немагчыма. Аднойчы арганізатар Аляксандр Дзмітрыевіч папрасіў з'ездзіць у лес — ссекчы для школы елку. Неяк падышоў ваенрук Яўген Феліксавіч і кажа: «Ты ж камсорг школы, напішы аб'яву, што трэба добраўпарадкаваць цір». Навошта аб'ява? Пазваў родная брата, стрыечнага, сябра, яны паклікалі сваіх сяброў, і мы гэтай кампаніяй пасля ўрокаў даводзілі яго да ладу, вызваляючы ад будаўнічага смецця. Затое потым былі ўзнагароджаны магчымасцю трэніравацца ў стральбе. Гэтым займаліся самазабыўна! Напачатку з пнеўматыкі (неяк Яўген Феліксавіч не мог зразумець, чаму папяровыя мішэні ўвесь час падаюць, пакуль не ўцяміў, што гэта я страляю па кнопках, якімі яны мацаваліся), потым з малакалібернай зброі.

У мяне была «індывідуальная» «СМ-2» (як зараз памятаю, серыйны нумар вінтоўкі заканчваўся на 46), браць некаму іншаму яе не дазвалялася, бо была прыстраляна пад мяне. Калі вельмі хацелася прагуляць урокі, я ішоў да ваенрука. А пасля са «сваёй» вінтоўкай і пачкам патронаў у кішэні шпацыраваў у цір. Трэніроўка, ведаеце, тлумачыў усім сустрэтым па дарозе настаўнікам ці нават дырэктару школы...

ДЗЯКУЮЧЫ такому стаўленню да нас з боку настаўнікаў, мы літаральна днявалі ў школе. Памятаю, як аднойчы з сябрам восенню вярталіся дадому. Былі ўжо прыцемкі, я зірнуў на гадзіннік — пяць гадзін. «Ды мы з табой таксама нібы змену адпрацавалі. Бач, людзі з работы ідуць». Не ведаю, як сучасныя школьнікі, а мы пасля заняткаў не беглі адразу дадому, а ішлі ў спартыўную залу гуляць у валейбол ці баскетбол, у фае «рэзаліся» ў настольны тэніс, друкавалі здымкі ў фоталабараторыі, рабілі нешта сваімі рукамі ў майстэрні, наведвалі той жа цір. Усе рабілася добраахвотна, бо нам сапраўды было цікава.

Калісьці нас перад школай таксама вучылі чытаць і лічыць, але вялікага фанатызму з боку бацькоў я не памятаю. Агульная пазіцыя дарослых была прыкладна такой: на тое яна і школа, каб усяму навучыць.

А настаўнікам, упэўнены, было цікава з намі. Бо ў прафесію ішлі свядома. Настаўнік — тады гэта сапраўды гучала ганарова. Выдатнікі вучобы, як правіла, рыхтаваліся да паступлення ў педагагічны, і гэтае рашэнне падавалася навакольным цалкам лагічным. Такія ахвотныя былі кожны год, у тым ліку і ў маім выпуску: некалькі чалавек абралі менавіта педагагічныя спецыяльнасці. Гэта пры тым, што ў той час увогуле не было 100-працэнтнага памкнення моладзі атрымліваць вышэйшую адукацыю! Ва ўніверсітэт ці інстытут, калі не памыляюся, з нашага выпускнога класа паступалі і паступілі тры чалавекі з 15. Ніхто не круціў пальцам каля скроні, як цяпер, калі медаліст выказваў жаданне стаць настаўнікам. А ведаеце чаму? Не памятаю выпадку, каб педагогі ў тыя ўжо далёкія часы публічна наракалі на свой цяжкі лёс, на загружанасць, на заробак...

P.S.: *Прашу прабачыць, калі не згадаў некага з настаўнікаў персанальна. Памятаю ўсіх, удзячны — многім...*

Сяргей РАСОЛЬКА. Фота аўтара

■

Адна з першых сустрэч выпускнікоў. Здагадайцеся, хто настаўніца?

■ Будзь у курсе!

ПРАФТЭХУСТАНОВЫ ЧАКАЮЦЬ МОЛАДЗЬ

У краіне працягваецца прыём дакументаў ва ўстановы прафтэхадукацыі: прафесійныя ліцэі і каледжы.

Як паведамляе прэс-служба Міністэрства адукацыі, у адпаведнасці з заканадаўствам былі працягнуты тэрміны прыёму ў 154 установы прафтэхадукацыі — да поўнага ўкамплектавання вучэбных груп, але не пазней чым да 15 верасня.

Абітурыентаў чакаюць на будаўнічых спецыяльнасцях і машынабудавання. Не ўкамплектаваліся таксама прафтэхустановы, дзе рыхтуюць кадры для лёгкай прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

■ Госць рэдакцыі

Фота Надзеі БУЖАН.

Эдгард ЗАПАШНЫ:

«ПАДАБАЕЦЦА, ЯК ПА-БЕЛАРУСКУ ГУЧЫЦЬ СЛОВА «ДЗЯРЖАЎНЫ»

Славуты артыст цырка даў эксклюзіўнае інтэрв'ю «Звяздзе»

У верасні знакамітыя расійскія дрэсіроўшчыкі браты Запашныя зноў выступяць у Беларусі. Для жыхароў Мінска прадстаўнікі легендарнай цыркавой дынастыі прэзентуюць спектакль «К.У.К.Л.А.», які, па словах Запашных, з'яўляецца адным з самых дарагіх шоу ў сумеснай кар'еры Эдгарда і Аскольда. Каб даведацца падрабязнасці, карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з Эдгардам Запашным, пагутарыў пра цырк, сяброўства з хакеістамі і асаблівасці беларускага жыцця.

«ШОУ АБЫШЛОСЯ АМАЛЬ У 7 МІЛЬЁНАЎ ЕЎРА»

— «К.У.К.Л.А. сапраўды з'яўляецца адной з самых маштабных нашых пастановак, — пачынае гутарку Эдгард. — Упершыню яе паказалі 2 з паловай гады таму ў Маскве і Санкт-Пецярбургу. На пастановачную частку пайшло каля сямі мільёнаў еўра. Адно толькі абсталяванне ўмясцілася ў 30 буйных машынах. У калектыў увайшлі каля 200 чалавек. Задзейнічана даволі шмат звяроў: тыгры, ільвы, коні, сабакі. У шоу багата нумароў, якія не адносяцца да класічнага цырка. Будуць і матацыклісты, якія выканаюць розныя трукі. Мы таксама запрасілі каскадзёраў, бо некаторыя з нумароў звязаны з рызыкай для жыцця.

— Даволі часта Мінск наведвае славуты «Цырк дзю Салей». Нашаму гледачу ёсць з чым параўноўваць.

— «К.У.К.Л.А.» дакладна не будзе саступаць. Яна істотна даражэйшая. Так, «Цырк дзю Салей» — значны канкурэнт, агульнасусветны брэнд, аднак, як паказвае практыка, іх імя большае за тое, што яны прывозяць. Нават «Квідам», шоу, якое яны паказвалі ў Беларусі, мела на мэце выкарыстоўванне толькі адной арэны, а мы запоўнім усю прастору «Мінск-Арэны». У нас нават не будзе партэра. Хакейную пляцоўку зойме сцэна. І тая колькасць артыстаў, эфектаў, якія мы прадставім, значна пераўзыдзе «Цырк дзю Салей». І я ні ў якім разе не перабольшваю, адказваю за кожнае слова. Мне важна не падмануць гледача.

— Вы першапачаткова планавалі гэты праект пад буйныя пляцоўкі?

— Рабілі яго пад маскоўскія «Лужнікі», пасля паказалі ў Палацы спорту «Юбілейны», што ў Санкт-Пецярбургу. Але «Мінск-Арэна» буйнейшая, шырэйшая за пералічаныя комплексы і можа змясціць значна большую колькасць гледачоў. Таму для нас гэтая пляцоўка з'яўляецца больш глабальнай.

— А што натхніла на стварэнне падобнага спектакля?

— Найперш здаровыя артыстычныя амбіцыі, калі ты імкнешся да таго, каб выйсці на сусветны ўзровень з іншым бюджэтам. У такім выпадку ставіш перад сабой іншыя задачы. І калі мы разам з братам пачалі агучваць падобныя ідэі, мары, многія спагадліва ляпалі нас па плячах, маўляў, хлопцы, марыць — гэта не шкодна. А сёння я нават не ведаю, хто, акрамя нас і «Цырка дзю Салей», бліжэйшага канкурэнта, здольны працаваць на «Мінск-Арэне». Гэта вельмі складана, адказна. І трэба пераканаць публіку з цырка прыйсці на стадыён. А многія гледачы нават ніколі не былі на спартыўных пляцоўках. І яны ідуць за намі, вераць у нас.

— Мне наогул здаецца, што цырк, які раней канцэнтраваўся ў манежах, становіцца стадыённай з'явай.

— Вы маеце рацыю ў адным. У нас сапраўды назіраецца падобная тэндэнцыя, хаця ў ЗША цырк «Рынглін бразэрс», аб існаванні якога многія нават не ведаюць, апошнія сто гадоў працуе выключна на вялікіх пляцоўках. Яны ўстанаўліваюць тры манежы. На пляцоўку выводзяць каля 60 сланоў. Гэты цырк і сёння займае лідзіруючыя пазіцыі на амерыканскім кантыненце, а іх праект мае назву «Найвялікшае шоу на зямлі». І яно сапраўды такім з'яўляецца. Але, з іншага боку, я адзначаю, што людзі сёння з асалодай ходзяць у шапіто, калі цырк прыязджае з невялічкімі праграмамі. Гледачам хочацца камернасці, быць бліжэйшымі да артыста, бачыць яго вочы, пот, які выступае на целе. У падобны цырк чалавек прыходзіць па іншыя эмоцыі. Таму казаць аб тым, што цырк сыходзіць на стадыён, нельга. Ён проста дэманструе разнастайнасць. Бо цяпер без цыркавых артыстаў, напрыклад, не абыходзіцца нават ніводнае адкрыццё і закрыццё Алімпійскіх гульняў.

«У ШКОЛЕ Ў МЯНЕ БЫЛА АДЗІНАЯ ЧАЦВЁРКА — ПА РУСКАЙ МОВЕ»

— Вы стварылі з дзясятак добрых цыркавых праектаў. А памятаеце, якім быў першы выхад на манеж?

— Разам з братам мы ўпершыню выйшлі на манеж у 1988 годзе ў Рызе. Мне было 12 гадоў, яму — 11. Гэта была навагодняя казка, якую паставіў наш бацька. І ён даверыў нам галоўную ролі. На той момант мы паказвалі толькі фрагменты будучых нумароў: дрэсура коней, жангліраванне, акцёрскае майстэрства.

— Хвалявалiся?

— Мы вельмі перажывалі. Калі раней не меў вопыту, выступаць у 12-гадовым узросце на публіцы немагчыма. Было, безумоўна, страшна. На той момант мне здавалася, што ўсё прайшло добра, а зараз узгадваеш і думаеш, які гэта быў правал.

— Вальтар Запашны, ваш бацька, стаў першым, хто вывеў на сцэну больш за 30 драпежнікаў і нават асядлаў ільва. Ён для вас з братам быў прыкладам ва ўсім?

— Тата найперш быў цудоўным артыстам, чалавекам, з якога можна браць прыклад. Ён сапраўды выводзіў на сцэну больш за 30 звяроў, але браў не колькасцю, а разнастайнасцю. Звяры былі розных відаў: ільвы, тыгры, пантэры, пумы, каракалы, гепарды, мядзведзі, коні, рысі... Многія з іх у прыродзе ніколі не перасякаліся.

— Дынастыя дрэсіроўшчыкаў Запашных паходзіць аж з пазамінулага стагоддзя. Сямейным радаводам не цікавіліся?

— Цікавіўся і ўжо трэці год запар я сур'ёзна займаюся гэтай тэмай. Адна мая памочніца складае сямейнае дрэва. І на кожны дзень нараджэння яна абяцае падарыць мне яго, але напярэдадні свята кожны раз кажа: «Эдгард, а можна пацярпець? Я яшчэ накапала!» Продкі па бацькоўскай лініі паходзілі з Украіны. З'яўляліся буйнымі землеўладальнікамі з сяла Багадухава. А па прабабчынай лініі мае сваякі былі цыркавымі артыстамі па прозвішчы Томпсан. Пазней мае бабуля і дзядуля нарадзілі майго бацьку Вальтара.

— Аскольд, Эдгард, Вальтар — імёны ў вашай сям'і, безумоўна, далёка неславянскія.

— Гісторыя іх, напэўна, закладзена ў Вальтары Запашным. У нас нямецкія карані, а таму, напэўна, бацьку далі падобнае імя. Яно было самым незвычайным у сям'і. Потым — яшчэ цікавей. Тата ажаніўся з Марыцай, у іх нарадзілася дачка, якую таксама назвалі Марыцай. З гэтага, верагодна, і распачаўся інтарэс да незвычайных імёнаў. Потым на свет з'явіліся Эдгард і Аскольд. Брат, дарэчы, ажаніўся з Элен, а дачок назваў Евай, Эльзай, а я — Стэфаніяй і Глорыяй. Вось такая ў нас традыцыя.

— Вы нарадзіліся ў Ялце, а пасля вандравалі разам з сям'ёй. Жылі нават у Кітаі. А ці было ў вас пастаяннае месца, дзе вы сустракаліся з сябрамі?

— Падобнае было магчымым толькі ў Маскве, дзе мы з'яўляліся раз у паўгода, а пасля зноў з'язджалі на гастролі.

— Дарэчы, менавіта ў Кітаі вы пафарбаваліся ў бландзінаў. Навошта?

— Жыццё прымусіла. Мы працавалі на стадыёне, адкрывалі шоу, пасля якога за намі рушыла цэлая кавалькада танцораў, дрэсіроўшчыкаў. З чорнымі валасамі нас не было відаць на арэне. І людзі не разумелі, што ідуць еўрапейцы. Кітайцы прапанавалі надзець парыкі, капелюшы з пёрамі, кідкія касцюмы, каб выдзяляцца. І тут наш бацька, даволі кансерватыўны чалавек, які не дазваляў насіць доўгі чубок, сказаў, што трэба пафарбавацца. Мы спачатку падумалі, што нам падалося. Але ён дадаў: «Дакладна кажу. Я ў свой час працаваў у белым парыку. Вам будзе пасаваць». І, безумоўна, мы адразу пабеглі і перафарбаваліся. Гэта было пэўнай праявай свабоды. Амаль 20 гадоў мы былі бландзінамі.

— Здаваць выпускныя іспыты ў школе было складана?

— Не, мы добра вучыліся. Брат скончыў школу на выдатна, а ў мяне была толькі адна чацвёрка — па рускай мове. Бацькі заўжды ўважліва ставіліся да нашай адукацыі. Нам ніколі не патуралі.

«СВАЁЙ МАНАЛІТНАСЦЮ ПАДАБАЕЦЦА ПАЛАЦ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ»

— Калі вы ўпершыню пабывалі ў Мінску?

— Дакладна не памятаю, але ў свой час тут працаваў тата, і мы нават вучыліся ў Мінску ў школе. Пасля доўга не наведвалі Беларусь, а 14 гадоў таму ўпершыню прыехалі ў вашу краіну з гастролямі.

— А цяпер многім здаецца, што наша сталіца стала для вас другім домам...

— У нас нават пытаюцца, а ці не збіраюцца Запашныя прыняць беларускае грамадзянства? *(Усміхаецца.)* Мы проста адкрылі для сябе магчымасць прыязджаць сюды, адчулі ўдзячнасць гледачоў, пашырылі свае межы. Акрамя таго, тут добрае геаграфічнае месцазнаходжанне. Дзякуй Богу, у Мінску ў нас усё атрымліваецца.

— Калі замежнік прыязджае ў Беларусь, ён адразу звяртае ўвагу на чыстыя вуліцы Мінска, шырокія праспекты. А на што звярнулі ўвагу вы пасля таго, як вярнуліся сюды пасля доўгага перапынку?

— Мінск мяняецца ў лепшы бок. У вас за аснову ўзята еўрапейская мадэль спакою. Для замежнікаў яна не з'яўляецца дасягненнем, а для мяне, як для жыхара Масквы, з'яўляецца. Ноччу сваю дзяўчыну ў Маскве я дакладна ніколі не адпусціў бы па прадукты ці пагуляць з сабакам. У некаторых раёнах уначы наогул лепш не з'яўляцца нават мне, фізічна падрыхтаванаму чалавеку. А ў Мінску значна спакайней. Людзі разумеюць ступень адказнасці. І хуліганы ведаюць, што ім нішто проста так з рук не сыдзе. Гэта вельмі вялікае дасягненне. Я называю гэта парадкам.

— Свой 38-ы дзень нараджэння вы адзначылі ў мінскім аквапарку. А якія яшчэ любімыя месцы адпачынку ў нашай сталіцы вы адзначыце?

— У мяне ніколі не бывае шмат часу на адпачынак у Мінску. Так, на жаль, атрымлівалася заўжды. Часта бываю ў мінскім заапарку і зычу, каб гэтае месца надалей квітнела. Бо я бачу, якія там створаны ўмовы для звяроў. Спадзяюся, ён надалей будзе толькі павялічвацца. Заўжды звяртаю ўвагу на ваш Палац Незалежнасці. Ён падабаецца сваёй маналітнасцю, знешнім выглядам.

— Упэўнены, вы заўважылі, што горад у нас двухмоўны. А якія беларускія словы вам асабліва спадабаліся?

— Такія словы і сапраўды ёсць. Напрыклад «дзяржаўны», якое напісана на будынку вашага цырка. Мяне таксама весяліць, калі ў самалёце гучыць: «зашпіліце-расшпіліце рамяні».

«ПАДЧАС СПЕКТАКЛЯЎ АГУЧВАЎ ВЫНІКІ ХАКЕЙНЫХ МАТЧАЎ»

— Летась у Мінску вы хадзілі на матчы першынства свету па хакеі і наведвалі «Рускі дом» — месца дыслакацыі расійскіх балельшчыкаў.

— Так, і я кантактую з хакеістам Жэнем Малкіным. Праўда, ніколі ў хакей не гуляў. У сваім жыцці я толькі адзіны раз стаяў на каньках, і тое было яшчэ ў школе. І ў які хакей мне гуляць у такім разе?

— Можна проста клюшку патрымаць...

— І пабегаць за Малкіным? *(Усміхаецца.)* Я нядаўна з Сашам Авечкіным гуляў у баскетбол, маці яго — двухразовая алімпійская чэмпіёнка ў гэтай дысцыпліне. І Саша ў баскетболе таксама ў поўным парадку.

— У красавіку, калі не памыляюся, вы апранулі форму барысаўскага БАТЭ, згулялі ў футбол з дзецьмі.

— Так, разам з Сяргеем Штанюком, былым гульцом зборнай Беларусі, мы паўдзельнічалі ў дабрачыннай акцыі, правялі майстар-клас. У футбол я гуляю нядрэнна, атрымліваю ад гэтага вялікую асалоду.

— Але хакей — прыярытэтны від спорту?

— Ён мне цікавы як гледачу. Гэта вельмі эмацыйная гульня, у якой у нас выдатныя традыцыі з савецкіх часоў. І ў адсочванні хакей для мяне займае больш высокае месца, чым футбол.

— Цыркавыя артысты збіраліся перад экранам, каб разам глядзець хакей?

— Падобнае і цяпер адбываецца. У 2000 годзе нашы саступілі ў фінале чэмпіянату свету, а мне праз хвіліну на манеж трэба выходзіць. Я тады проста хацеў сказаць: «Наша прадстаўленне завершана. Да новых сустрэч!» Настрой быў проста на нулі. А калі ў Беларусі праходзіла першынство свету, многія матчы, у тым ліку з удзелам беларускай зборнай, ішлі паралельна з нашымі спектаклямі. І я асабіста ў антракце, пасля спектакля аб'яўляў вынікі матчаў. Многія адным вокам глядзелі прадстаўленне, а другім — на вынікі матчаў у тэлефоне.

— Зусім нядаўна Эдгард Запашны, вядомы дрэсіроўшчык, дырэктар, перакваліфікаваўся ў вядучыя праграмы пра цырк на канале «Зорка»...

— Мы ўжо знялі адзін сезон «Легендаў цырка з Эдгардам Запашным», падпісалі кантракт на другі. Гэта адзіная праграма на расійскім тэлебачанні, якая цалкам прысвечана цырку і яго героям. Да падобнай працы прыйшоў паступова. Я ўжо здымаўся ў кіно і ў розных тэлепраектах. Таму роля вядучага не з'явілася для мяне нечым фантастычным. Новай аказалася роля прадзюсара.

— Самае складанае, напэўна, зняць праграму пра бацьку.

— Пра яго праграму пакуль не зрабіў. У некаторых выпусках мы яго ўзгадвалі, аднак для мяне Вальтар Запашны — гэта відавочная легенда цырка. А асноўная ідэя праекта — знаёмства з легендамі, аб якіх шырокая аўдыторыя не ведае. Пра тату зраблю праграму абавязкова. Праўда, у мяне ёсць падводны камень. Без інтэрв'ю з маці стварыць яе не атрымаецца. А ёй яшчэ балюча ўзгадваць, што таты няма. І краналь гэтыя пачуцці мне зараз не хочацца.

Тарас ШЧЫРЫ.
taras@zviazda.by

ВЕДЫ — СІЛА!

Кожны год падчас уступнай кампаніі нервуюцца не толькі абітурыенты, нервуюцца іх бацькі, настаўнікі, шырокае кола радні. Па сабе гэта ведаю, бо некалі «паступаў» разам з дзецьмі, а сёлета — ужо з унукам. Ён універсітэт сабе выбраў даўно, факультэт — таксама, але ж сямейны савет яго матуля сабрала: можа, нехта нешта параіць, падкажа...

Ну, мы і раілі. А заадно — успаміналі, як хто куды паступаў, як вучыўся, як «гарэў» на шпаргалках, каму ўсміхалася пані ўдача, а каму, здаралася, і не.

Узяць вось мяне. Некалі перад уступным экзаменам па хіміі купіў я ў шапіку часопіс «Хімія і жыццё», прачытаў там артыкул аб атрыманні хімічнага злучэння інертнага газу ксенону. «Во, — яшчэ падумаў, — а ў школе ж нам даводзілі, што інертныя газы ў хімічныя рэакцыі не ўступаюць!..»

Што называецца, здзівіўся і забыўся! Назаўтра здаю экзамен па хіміі, выцягваю білет і бачу — адно з пытанняў якраз пра інертныя газы.

Ну, я і пачаў казаць экзаменатарам пра хімічнае злучэнне.

Тыя насцярожыліся, спыталіся ў мяне, адкуль я гэта ведаю. Я смела адказаў, што прачытаў у часопісе «Хімія і жыццё».

Больш пытанняў да мяне не было: экзаменатарка — на што я ніяк не разлічваў — паставіла... выдатна!

Відавочна: мне дапамог выпадак, бо той часопіс я гартаў першы і апошні раз у жыцці!

«Так што лепш разлічваць на веды», — параіў я ўнуку і (да слова прыйшлося) расказаў усім пра свайго (светлай памяці!) суседа Васіля Яўлампіевіча. Ён у школе цягнуў на залаты медаль: па ўсіх, без выключэння, прадметах пяцёркі меў. Але ж у тыя гады (пачатак пяцідзясятых мінулага стагоддзя) медалі выдавалі не толькі па ведах. Была яшчэ і так званая разнарадка. У прыватнасці, на іх школу «прыпадаў» адзін залаты медаль (ён, дарэчы, быў пропускам у любую ВНУ без уступных экзаменаў)...

Дык вось. Выклікае Васіля дырэктар школы і кажа: «Медаль ты сапраўды заслужыў. Аднак не крыўдуй і нікуды не скардзіся (а яно ж каб і хацеў — куды?): медаль мы аддадзім Івану Н. (яго дзядзька працаваў загадчыкам райана). А ты паступіш і так...»

Як у ваду дырэктар глядзеў: усе экзамены хлопец і сапраўды здаў на выдатна, стаў Настаўнікам (так-так — з вялікай літары!). Так што наказ унуку я даў адзін — стаўку рабіць на веды!

Валерый ГАЎРЫШ,
г. Чавусы.

ШТО ТОЙ САЛДАТ, ШТО ГЭТЫ... НЕ СКАЖЫЦЕ!

Некалі на неабсяжных прасторах СССР вялікай папулярнасцю карысталася наша гарэлка ўвогуле і моцная «Белавежская» ў прыватнасці: цанілі яе масквічы.

Пра адзін выпадак, звязаны з гэтым напоем, расказаў мне добры знаёмец, на той час — старшыня Мінскага аблспажыўсаюза.

Дык вось. Неяк у Беларусь наведаўся міністр абароны СССР маршал Савецкага Саюза Дзмітрый Усцінаў. Прымалі яго адпаведна — і займаемай пасадзе, і званню, і аўтарытэту: ад душы, што называецца... На сталах, вядома ж, хапала ўсяго! А ўжо розных заморскіх напояў, дык, можна сказаць, безліч было.

Дзве бутэлечкі «Белавежскай» ставілі проста так, чыста сімвалічна.

Але ж аднойчы села кампанія вячэраць, аглядзела стол. Маршал пацягнуўся было да каньяку «Напалеон» (ён тады каштаваў у разы даражэй, чым армянскі ці грузінскі), аднак піць яго чамусьці не стаў: пачытаў этыкетку і дэманстратыўна адставіў убок — узяў... «Белавежскую».

Гэты ж напой, гледзячы на маршала, абралі і некаторыя з іншых застольнікаў. Выпілі па першай, потым па другой — два штофы з гарэлкай амаль апусцелі. Гаспадарам на добры толк трэба падносіць яшчэ. Але ж дзе яе ўзяць, калі болей няма... Бо ніхто ж не падумаў, што менавіта «Белавежская» можа спатрэбіцца.

Карацей, гаспадар — той самы старшыня аблспажыўсаюза, ён жа адказны за кулінарны бок справы, быў у паніцы: дзе выйсце, што рабіць? І сам ніколі, мусіць, не здагадаўся б! Усё, як гэта часта бывае, вырашылі кадры: «адна хвіліначка» — і на стале зноў з'явіліся дзве пляшкі «Белавежскай»! Бяседа пацякла далей — як нічога ніякага...

Але ж падчас нейкага перапынку да гаспадара падышоў той высокі госць, даверліва паляпаў яго па плячы і з усмешкай шапнуў:

— А наша «Петровская» почти как ваша «Беловежская»!

...Высветлілася, што Дзмітрый Усцінаў быў выдатны знаток не толькі ваеннай справы... Ён ведаў яшчэ і напоі, таму афіцыянтка, якая ў пляшкі з-пад «Белавежскай» наліла «Пятроўскай» (дарэчы, вельмі падобнай па колеры і смаку), абхітрыць яго не змагла.

Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ,
г. Мінск.

БЯСПЛАТНЫ СЫР ТОЛЬКІ Ў МЫШАЛОЎЦЫ

Не сакрэт, чалавеку ў гадах шмат што ўспамінаецца, і прыемнае, і, мякка кажучы, не вельмі. Пра адзін такі эпізод, трэба, лічу, расказаць чытачам сваёй любімай газеты: можа, ён навукай некаму стане.

Дык вось. Кіравала я тады адной з невялікіх устаноў. Дужа свядомая была, працавала старанна, аддана, не шкадавала ні здароўя свайго, ні часу...

Што прыемна, кіраўніцтва бачыла гэта, заўсёды хваліла, а неяк дык нават узнагародзіла. Прычым не банальнай прэміяй, не медалём, а... новенькай легкавушкай! Хай сабе і службовай!

Форсу праз гэта ў мяне аж да неба! Па-першае, жанчына за рулём у тыя гады была вялікай рэдкасцю. Па-другое, машына вырашала многія праблемы, дазваляла, прынамсі, яшчэ больш паспяваць, па-трэцяе, такіх узнагарод не мелі мае калегі-мужчыны, па-чацвёртае...

Калі, карацей, я паспяхова здала на правы і трэба было некуды пад'ехаць, больш нікога не прасіла. Самастойная, можна сказаць, незалежная — гэта, вядома ж, плюс! А мінус быў у тым, што прасіць цяпер сталі мяне.

У прыватнасці, у той дзень, надвячоркам, у кабінет зайшлі жанчыны (мая каляжанка і дзве яе сваячкі) і з парога замалілі:

— Маргарыта Іванаўна, завязіце нас у памідоры! Мы знаем куды... Там іх столькі, што аж поле чырвонае! Усё роўна ж прападуць... Ведама — калгасныя... А Маруся сабе прывезла — на ўсю зіму назапасіла.

— Як гэта «прывезла»? — насцярожылася я. — Яны што — у лесе растуць, бяры — не хачу, што называецца?

— Так! Вартаўнікоў няма!

— Не, нешта не тое вы, дзеўкі, кажаце!

— Тое, Маргарыта Іванаўна! Мы вас вельмі просім — звазіце... Бо вы ж і сапраўды калгас той знаеце — прападуць! Ну, можа, не ўсе, але ж шмат... А мы б іх у слоічкі — намарынавалі, соку наставілі...

Цяжкі выпадак: і адмовіць жанчынам як быццам не выпадае, але ж і паехаць — таксама!

Думала я, думала, а ўрэшце ўльтыматум паставіла. Маўляў, так: я праз вашы татарскія набегі з работы і пасады паляцець не хачу. А таму добра: я вас завязу, але, калі зловяць, мы незнаёмыя. Згодны?

— Згодны!

І вось канец працоўнага дня, сонца, можа, на качаргу стаіць над лесам, а мы, тры жанчыны (адна з мужам — танклявым, высозным, ну як цэп!) едзем па памідоры, а праўдзівей — па прыгоды на свае маладыя галовы. Едзем ды смяёмся, што мужчына, калі што, напэўна ж уцячэ. Ён, маўляў, як заяц — скок, скок на сваіх даўжэзных нагах і ў лесе. А вось кабеце адной (яна па камплекцыі нібы той калабок) — усё, турма.

Ужо прыцемкам мы прыехалі ў блізкую да поля вёску. Я, пажадаўшы ўдачы і яшчэ раз нагадаўшы, каб на мяне не спадзяваліся, высадзіла пасажыраў. Сама — заехала ў сяло, адкрыла капот машыны, быццам нешта там праўлю і раптам чую: «Ба-бах! Ба-бах!..» Страляюць! «Ну ўсё, — думаю, — папаліся! Што ж рабіць?»

А насустрач па вуліцы ўжо машына імчыць і... спыняецца каля мяне.

За рулём — бачу — кіраўнік таго самага калгаса, побач з ім — аграном, а ззаду — так і ёсць! — мой пасажыр, той самы «цэп».

— Што здарылася, Маргарыта Іванаўна? — пытаецца ў мяне старшыня. — Дапамога наша патрэбна?

— Не, — кажу струпянеўшы.

— Глядзіце... А то мы якраз у кантору едзем. Злодзея во злавілі — з пустой сумкай, на полі з таматамі.

І таўхель таго ў плячо:

— Гавары, на чым прыехаў? Хто цябе прывёз?

Я думала, што самлею, бо зайцы — яны ж баязлівыя: гэты вось «здасць» зараз, як пустую бутэльку, і ўсё: мне канцы — жыццё зламана...

Аднак мужчына, дзякаваць Богу, змаўчаў.

Мы рассталіся: мужчыны паехалі ў калгасную кантору, я на машыне трохі пакружыла па ваколіцах ды спынілася на шашы Мінск — Шклоў.

Стаю там, а сэрца з грудзей як не выскачыць, бо вакол жа лес, мёртвая цішыня і цемра, а пасажырак маіх няма і ў паміне! Дзе яны цяпер? На якую дарогу выйдуць? Калі?..

Чакаць іх сэнсу не было, і я з цяжкой душой паехала дамоў...

Не ведаю, як дачакалася раніцы! Але ж дазналася, што жанчыны мае (таксама ледзь жывыя ад страху і, вядома ж, без памідораў) праз нейкі час выйшлі на шашу, злавілі спадарожную машыну...

На мяне з іх боку крыўды не было. Толькі «заяц» яшчэ доўга касіўся...

Але ж на тое ён і «заяц».

А.С.
Мінская вобласць.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.
dounar@zviazda.by

ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ВЕРАСЕНЬ

2 верасня, серада. Добры дзень для стрыжкі валасоў.

3 верасня, чацвер. Пасля стрыжкі ў гэты дзень валасы будуць адрастаць павольна. Таму дзень больш падыходзіць для аматараў кароткіх прычосак.

4 верасня, пятніца. У гэты дзень добра рабіць лёгкія паветраныя прычоскі. Стрыжка ніяк не паўплывае на стан валасоў.

5 верасня, субота. Стрыжка валасоў прынясе здароўе, прадухіліць крыўды — вашы і на вас.

6 верасня, нядзеля. Вельмі дрэнны дзень для развітання з лішнімі валасінкамі.

7 верасня, панядзелак. Пасля стрыжкі ў дні Рака прычоска абсалютна не трымае форму, валасы становяцца непаслухмянымі, не паддаюцца ўкладцы.

8 верасня, аўторак. Дзень не падыходзіць для стрыжкі, ад афарбоўвання таксама лепш устрымацца.

9 верасня, серада. Добры дзень для стрыжкі, якая ў такія дні робіць валасы прыгожымі, пышнымі і шаўкавістымі.

10 верасня, чацвер. Удалы час для ўдасканалення! Асмельвайцеся, эксперыментуйце, прычым не толькі з даўжынёй валасоў, але і іх колерам.

11 верасня, пятніца. Добры дзень для аздараўлення валасоў. Стрыжка зробіць іх пышнымі і густымі.

12 верасня, субота. Дзень вельмі неспрыяльны для стрыжкі, афарбоўвання і іншых цырульніцкіх працэдур.

13 верасня, нядзеля. У дзень сонечнага зацьмення ўсе маніпуляцыі з валасамі лепш адкласці.

14 верасня, панядзелак. Гэты дзень выдатна падыходзіць для стрыжкі; больш за тое, стрыжка дапаможа прыцягнуць у жыццё каханне, новыя перспектыўныя знаёмствы і яркія ўражанні.

15 верасня, аўторак. Выдатны дзень для стрыжкі валасоў: новая прычоска прынясе здароўе вашым валасам і прывабнасць вам.

16 верасня, серада. Нейтральны дзень для стрыжкі.

17 верасня, чацвер. Сёння спрыяльны дзень для візіту ў салон. Аднак пры гэтым не варта эксперыментаваць і рэзка мяняць звыклы для вас вобраз.

18 верасня, пятніца. Стрыжка ў гэты дзень робіць валасы непаслухмянымі, хоць тым, хто хоча, каб валасы пасля стрыжкі мелі схільнасць да завівання, гэта можа быць і на карысць.

19 верасня, субота. Стрыжка не зменіць структуры і якасці валасоў, яны будуць хутчэй расці.

20 верасня, нядзеля. Стрыжка прынясе шчасце і ўпэўненасць у сабе.

21 верасня, панядзелак. Сёння не варта стрыгчы валасы, інакш вы можаце страціць нешта каштоўнае для сябе.

22 верасня, аўторак. Добры дзень для стрыжкі. Афарбуйце валасы ў свой натуральны колер — гэтым вы прыцягнеце да сябе патрэбных людзей.

23 верасня, серада. Ідэальны дзень для таго, каб змяніць свой імідж, таму можаце рабіць любую стрыжку.

24 верасня, чацвер. Стрыжка актывізуе вашу асабістую энергетыку, узмоцніць харызму. Рэкамендуецца для аздараўлення дыхальнай і выдзяляльнай сістэм.

25 верасня, пятніца. Сёння не дзень для наведвання цырульніка — стрыжка негатыўна адаб'ецца на структуры валасоў і на вашай уласнай самаацэнцы.

26 верасня, субота. Неспрыяльны дзень для стрыжкі і мыцця галавы. Можа з'явіцца перхаць, праблемы са зрокам.

27 верасня, нядзеля. Неспрыяльны час для стрыжкі. Існуе рызыка выпадзення валасоў, аблысення і страты сувязі з космасам.

28 верасня, панядзелак. Не рэкамендуецца рабіць стрыжку ў дні зацьменняў.

29 верасня, аўторак. Спрыяльны для стрыжкі дзень, аднаўлення пашкоджаных валасоў.

30 верасня, серада. Спрыяльны дзень для стрыжкі і афарбоўвання валасоў. Стрыжка прыцягне шчасце, палепшыць знешні выгляд.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

01 октября 2015 года

проводит 17-ый открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номера лотов	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
267	Кузов-фургон К2.375 № 03093 1980 г. 2 кат., Автошасси УРАЛ-375 ш. 321456 дв. 113520 1980 г. 3 кат. 757 км	г. Кричев-2, в/ч 33190	56 000 000	5 600 000
268	Кузов-фургон К2.375 № 07126 1979 г. 2 кат., Автошасси УРАЛ-375 ш. 311365 дв. 018071 1979 г. 3 кат. 2306 км	г. Кричев-2, в/ч 33190	56 000 000	5 600 000
269	Кузов-фургон К2.375 № 02093 1979 г. 2 кат., Автошасси УРАЛ-375 ш. 293381 дв. 852353 1979 г. 3 кат. 2265 км	г. Кричев-2, в/ч 33190	56 000 000	5 600 000
270	Кузов-фургон К2.375 № 11135 1982 г. 2 кат., Автошасси УРАЛ-375 ш. 390530 дв. 789395 1982 г. 3 кат. 1182 км	г. Кричев-2, в/ч 33190	56 000 000	5 600 000
271	Автошасси Урал-375 ш. 367983 дв. 564671 1981 г. 4 кат. 9180 км	н.п. Столбцы-2, в/ч 25819	35 000 000	3 500 000
272	Автошасси Урал-375А ш. 401704 дв. 913527 1983 г. 4 кат. 6512 км	н.п. Столбцы-2, в/ч 25819	35 000 000	3 500 000
273	Автошасси Урал-4320 ш. 061348 дв. 959304 1986 г. 4 кат. 8900 км	н.п. Столбцы-2 в/ч 25819	48 000 000	4 800 000
274	Автошасси Урал-375А ш. 383337 дв. 718422 1982 г. 4 кат. 1281 км	н.п. Столбцы-2, в/ч 25819	35 000 000	3 500 000
275	Автошасси Урал-375Д ш.356626 дв. 453056 1981 г. 4 кат. 1594 км	н.п. Столбцы-2, в/ч 25819	35 000 000	3 500 000
276	Автошасси Урал-375АМ ш. 388658 дв. 771716 1982 г. 4 кат. 1329 км	н.п. Столбцы-2, в/ч 25819	35 000 000	3 500 000
277	Автошасси Урал-375АМ ш. 416492 дв. 411706 1984 г. 4 кат. 1641 км	н.п. Столбцы-2, в/ч 25819	35 000 000	3 500 000
278	Автошасси Урал-375А ш. 353696 дв. 418522 1981 г. 4 кат. 1517 км	н.п. Столбцы-2, в/ч 25819	35 000 000	3 500 000
279	Автошасси Урал-375АМ ш. 415797 дв. 068472 1984 г. 4 кат. 1428 км	н.п. Столбцы-2, в/ч 25819	35 000 000	3 500 000
280	Автошасси Урал-375А ш. 342011 дв. б/н 1980 г. 4 кат. 2165 км	н.п. Столбцы-2, в/ч 25819	35 000 000	3 500 000
281	АТМЗ-5-4320-1012 (автотопливомаслозаправщик) с/о 5292 на УрАЛ-4320 ш. 10141785 дв. 566572 1990 г. 4 кат. 58377 км	г. Гродно, в/ч 05733	196 000 000	19 600 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 01 октября 2015 г. в 11.00.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 28 сентября 2015 года**.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х дней с момента проведения аукциона**.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10**-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, обеспечение штрафа и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**.

Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81.

Наш адрес в интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА С ПОНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ

Предыдущее извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 25.04.2015

ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества с понижением начальной цены

Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей».

Предмет аукциона (сведения о продаваемом имуществе, характеристики)	Наименование (назначение) – **Здание многофункциональное**. Адрес объекта – **г. Минск, ул. Куйбышева, 19А.** Характеристики – капитальное строение с инвентарным номером 500/С-1381 – отдельно стоящее трехэтажное кирпичное здание, 1993 г. постройки, **общей площадью 612,5 м кв.**, площадь застройки – 181,0 м кв., расположенное на земельном участке площадью 0,0360 га, предоставленном на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания здания производственного корпуса (кадастровый номер – 500000000007000740). Объект имеет обременения в виде договоров аренды. Условия дальнейшего использования объекта – в соответствии с регламентом генерального плана г. Минска.
Начальная цена предмета аукциона (в т.ч. НДС 20%)	Сумма, эквивалентная **771 750 долларам США.**
Задаток	Сумма, эквивалентная **77 175 долларам США.**
Шаг аукциона	5%
Сведения об организаторе торгов, его местонахождении и контактные телефоны	ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» 220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 25, тел.: 8 017 286 78 59, факс: 8 017 286 76 80.
Сведения о продавце, его местонахождении и контактные телефоны	ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» 220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 25, тел.: 8 017 286 78 59, факс: 8 017 286 76 80.
Срок подписания договора купли-продажи	Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона.
Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона	Победитель аукциона в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона.
Условия оплаты	Оплата стоимости приобретенного на аукционе объекта осуществляется в срок, который будет установлен в договоре купли-продажи. Оплата задатка и лота производится резидентами в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день платежа на следующие банковские реквизиты: р/с 3012000790020 в ОАО «Банк БелВЭБ», код 226, г. Минск, пр-т Победителей, 29. Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Оплата задатка и лота производится нерезидентами в долларах США или в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день платежа на следующие банковские реквизиты: Сч./Асс.: 3012000790020 (BYR); Сч./Асс.:3012000790003 (USD) SWIFT CODE : BELBBY2X ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, пр-т Победителей, 29 БИК: 153001226 Банк корреспондент CITIBANK N.A., NEW YORK SWIFT CODE: CITIUS33 Acc.36249772. Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240. ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.
Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе	Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 23 сентября** в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 312.
Место, дата и время проведения аукциона	Аукцион состоится **28 сентября 2015 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, зал совещаний ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ».

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей», размещенном на сайте **www.horizont-group.com, раздел «Аренда: Аукционы»**

Дополнительная информация по тел.: +375 17 284 94 32; +375 29 663 39 18.
E-mail: Dikun@horizont.bn.by, www.horizont-group.com, раздел «Аренда: Аукционы»

ОАО «Стройтрест №4»

сообщает, что в соответствии с решением внеочередного собрания акционеров от 20 августа 2015 года выплата дивидендов за 1 полугодие 2015 года будет производиться с 18 сентября до 1 октября 2015 года через отделения ОАО «АСБ Беларусбанк», ОАО «БПС-Сбербанк» и кассы филиалов Общества.

Справки по тел. в г. Минске: 334-10-03 с 9.00 до 18.00 в рабочие дни по адресу: г. Минск, ул. Коммунистическая, 17, каб. 302.

УНП 100055368 ***Наблюдательный совет***

УНП 100258980

Открытое акционерное общество

«Минский домостроительный комбинат»,

расположенное по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43, извещает акционеров о том, что 16 сентября 2015 г. в 15.00 в актовом зале предприятия состоится ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

О начислении и выплате дивидендов за первое полугодие 2015 года.

С проектами решения собрания акционеры могут ознакомиться в рабочие дни, начиная с 9 сентября 2015 года по месту нахождения Общества (инвестиционный отдел, 3-й этаж).

